ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 85 (2445)
28 кастрычніка 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДЗЕЯЧЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА, РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ! ВЫСОКА НЯСІЦЕ СЦЯГ ПАРТЫЙНАСЦІ САВЕЦКАГА МАСТАЦТВА, АДДАВАЙЦЕ ЎСЕ СІЛЫ І ЗДОЛЬНАСЦІ ВЫХАВАННЮ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМА!

З Заклікаў ЦК КПСС да 52-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

100 Назар БЫВАЕЎСКІ

ЛЕНІН, ЯК ЯГО ЧУЎ І БАЧЫЎ

Гэтыя ўспаміны вядомага беларускага грамадскага дзеяча, драматурга і крытыка Язэпа Дылы, надрукаваныя ў студзені 1924 года, адразу пасля смерці Леніна, у газеце «Савецкая Беларусь».

Аўтар іх—Я. Дыла, які ў друку выступаў пад псеўданімамі Назар Бываўскі і Тодар Кулеша, у час утварэння БССР (студзень — люты 1919 г.) уваходзіў у склад Часовага Савецкага рабоча-сялянскага ўрада БССР, як камісар працы.

ДВА РАЗЫ я бачыў і чуў яго. І забыць гэтага ніколі не змагу. Першы раз гэта было ў лістападзе 1918 г., калі ўся рабочая Масква з чырвонымі штандарамі сышлася к свайму Савету, каб вітаць нямецкую рэвалюцыю, вестку аб якой прынесла ў сталіцу Савецкай Расіі радыё. Мне ўдалося папасці на Цвярскую к таму моманту, калі на балконе Маскоўскага Савета неспадзявана з'явілася характэрная фігура правадыра сусветнага пралетарыяту.

— А! — ахнулі праходзячыя калоны.

— Ленін! Ленін! Ільіч! — прабегла па радах.

Сцяна людзей стала, згрудзілася.

І моцны, зычны голас Леніна пранёсся над усім плацам. Ён гаварыў з незвычайным уздымам, характарызаваў умовы Германіі, сусветную сітуацыю, гаварыў аб абавязку нашым падтрымаць нямецкі пралетарыят... Ён перасцерагаў аб перашкодах, якія стаяць на дарозе сусветнай сацыяльнай рэвалюцыі. Проста, выразна выказаны былі ўсе яго думкі, ён, відаць было, радаваўся таму, што нямецкі імперыялізм, які дыктаваў свае ўмовы, сам трэснуў на смерць.

Запоўнены тысячамі людзей плац стаяў нерухома і ў поўнай цішы слухаў Леніна.

Зусім пры іншых умовах давялося мне чуць дарагога Ільіча ў Маскве на III з'ездзе Саўнаргасаў у зале Метраполя. Як дэлегату Цэнтрасаюза [з дарадчым голасам] мне прыйшлося прымаць тады ўдзел у гэтым з'ездзе.

Усялякая практычная работа на з'ездзе не ішла, бо ўжо два-тры дні ішлі несупынныя гарачыя спрэчкі ў пленуме [агульным сходзе] з'езда аб тым: ці адзінаначальна кіраваць гаспадарчымі органамі, ці калегіяльна. Меншавік Абрамовіч пацяшаўся і зласловіў аб гаспадарчых няўдачах Савецкага ўрада. А сход, разбіўшыся на дзве часткі, вёў трэці дзень адны толькі спрэчкі, як лепш кіраваць гаспадаркай.

Трэці вечар канчаўся, калі прыблізна каля 9 гадзін вечара нібы электрычны ток прабег па зале.

— Ленін Ленін! — загаманілі кругом, і галовы павярнуліся туды, дзе з'явілася каранастая, моцна зладжаная фігура Ільіча.

Не кончыўшы сваёй прамовы з кафедры збег па знаку прэзідыума дваццаты мо за гэты дзень прамоўца.

Рашуча скінуўшы паліто і зняўшы сваю мехавую шапку, Ленін узбег на кафедру, хусткай энергічна выцер намёрзлыя вусы [быў вялікі якраз мароз] і распачаў.

Гаварыў перш марудна, паўтараючы думкі, каб іх замацаваць у свядомасці слухачоў, — але праз хвілін 10 ужо «біў молатам». Так, так! — Гвоздзіў!

— Замест таго, каб у з'ездавых камісіях падабраць дзесятак-другі такіх работнікаў, якім бы маглі даверыць адналічна кіраваць справамі, вы трэці дзень абгаварваеце спрэчную нібыта яшчэ справу, выпрацоўваеце рэзалюцыі, якія ўжо абрыдлі і якія ні на ёту не пасунуць самую справу гаспадаркі! — Што такое калегіяльнасць! — Гэта значыць: Пятроў, Сідараў, Тодараў і гэтак далей. Ніхто з іх не адпавядае асабіста і г. д.

Ён рэзка крытыкаваў «таманілку», расказваў, што справа рэвалюцыі не церпіць адных толькі размоў, што пара брацца за работу...

Калі ён кончыў, уся зала, а ў тым ліку і «калегіяльшчыкі», бурна віталі свайго важака, свой партыйны розум, мозг рэвалюцыі...

Публікацыя М. КАМІНСКАГА.

СВЯТА Ў ВЕРХМЕНІ

АДКРЫЦЦЕ МЕМАРЫЯЛЬНАЙ ДОШКІ Ў ПАМЯЦЬ АБ НАСТАЎНІЦКАЙ ПРАЦЫ ЯКУБА КОЛАСА

Многа на нашай зямлі памятных месц, звязаных з жыццём і творчасцю народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Адно з іх — вёска Верхмень, што ў Смалявіцкім раёне. Тут у гады царскага самаўладства настаўнічаў будучы паэт.

Непрыглядны выгляд мела Верхменская школа, калі сюды прыехаў малады настаўнік. «Клас быў пусты і халодны. Даўно не беленыя сцены насілі на сабе сляды розных пашкоджанняў. Тынк у розных мясцінах быў абабіты. Праз яго сваліцца пераплёты дранак, прыбітых да сцен. Геаграфічныя карты віселі, дзе папала і як папала», — з горыччу пісаў пазней Якуб Колас, успамінаючы тыя далёкія гады.

Але і ў гэтай глухамані, у гэтым забытым богам і людзьмі краі ён адкрываў людзям вочы на тое добрае, што цеплілася ў іхніх сэрцах, клікаў іх да праўды і святла, змагацца за волю і лепшую долю. Аб жыцці верхменцаў ва ўмовах царызму, аб непаўторнай прыгажосці гэтага незабыўнага кутка роднай Беларусі пісьменнік расказаў у першай частцы трэцяй кнігі трылогіі «На ростанях», якую назваў «Верхань».

І вось у мінулую пятніцу, 24 кастрычніка, каля вялізнага трохпавярховага будынка Верхменскай сярэдняй школы, якая носіць імя Героя Савецкага Саюза Віктара Тумара, сабраліся вучні і настаўнікі з навакольных вёсак, мясцовыя жыхары, прадстаўнікі партыйных і савецкіх арганізацый Смалявіцкага раёна, пісьменнікі, супрацоўнікі Літаратурнага музея Якуба Коласа на чале з дырэктарам, сынам паэта Данілам Міцкевічам, каб ушанаваць светлае імя песняра.

Пасля ўрачыстай пінерскай лінейкі мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі на будынку Верхменскай школы ў памяць аб настаўніцкай працы Канстанціна Міхайлавіча ў гэтых мясцінах, адкрывае намеснік старшыні Смалявіцкага райвыканкома М. Надзеін.

Горача і ўсхвалявана гаварыў пра народнага паэта, выдатнага майстра мастацкага слова і цудоўнага педагога, дырэктар школы Ф. Лявоненка.

Па прыступках на школьны ганак падымаецца стары. Ён многа чаго бачыў за сваё жыццё і яму ёсць пра што расказаць. Гэта Міхалай Сцяпанавіч Мініч, вучань Якуба Коласа, той самы Грышка Мініч з трылогіі «На ростанях». Ён з вялікай пашанай і ўдзячнасцю гаворыць пра свайго незабыўнага настаўніка, які вучыў маладое пакаленне любіць сваю бацькаўшчыну, родны народ, яго мову і культуру.

Наступае ўрачыстая хвіліна. Міхалай Сцяпанавіч разрэзае чырвоную істужку і здымае белае палатно. Перад позіркамі прысутных адкрываецца мармуровая дошка, на якой залатымі літарамі напісана:

«У нашай вёсцы ў 1906 годзе працаваў настаўнікам народны паэт Беларусі Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)».

Аб той вялікай ролі, якую адыграў народны пясняр у развіцці нашай літаратуры, культуры і роднай мовы, аб сваёй вучобе ў Беларускім педтэхнікуме, дзе методыку беларускай мовы выкладаў Канстанцін Міхайлавіч, памятных сустрэчах з любімым настаўнікам расказаў і другі вучань Якуба Коласа, адзін са старэйшых нашых паэтаў Станіслаў Шушкевіч. У заключэнне ён прачытаў свой верш «Якубу Коласу».

Вершы, прысвечаныя вялікаму паэту, прачыталі таксама Пятро Прыходзька і Генадзь Кляўко.

З чытаннем твораў Якуба Коласа выступілі заслужаны дзеяч культуры БССР Аляксей Слесарэнка.

З вялікай цікавасцю прысутныя агледзелі школьны музей, дзе сабраны матэрыялы аб жыцці і творчай дзейнасці паэта і яго настаўніцкай працы ў Верхмені.

М. БАЗАРЭВІЧ.

Былы вучань Якуба Коласа М. С. Мініч (справа) і сын паэта Д. К. Міцкевіч.

Фота І. КУРБЕКІ.

З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА РАДЗІМА...

Беларускае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, як вядома, створана летам 1965 года. За гэты час членамі таварыства сталі каля чатырохсот тысяч чалавек. Больш чатырох тысяч калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў з'яўляюцца яго юрыдычнымі членамі. Ужо адно гэта гаворыць аб тым, што арганізацыйная работа праведена немалая. Шмат за гэты час было выяўлена новых помнікаў гісторыі, культуры і мастацтва, археалогіі. Усяго ўзята пад ахову дзяржавы ўжо 6799 помнікаў, у тым ліку, 78 помнікаў архітэктуры.

У нас чамусьці прынята гаварыць, што помнікамі архітэктуры з'яўляюцца толькі тыя будынкі і комплексы, якія маюць ахоўныя дошкі і ўключаны ў спісы помнікаў. Але акрамя іх ужо выяўлена на тэрыторыі рэспублікі і ў бліжэйшы час будуць узяты пад ахову дзяржавы яшчэ звыш паўтараста помнікаў архітэктуры XIII—XIX стагоддзяў. Сярод іх такія збудаванні, як замак і касцёл XVII стагоддзя ў Гальшанах, домік Пятра I, будынак былой брацкай школы XVII стагоддзя (домік Сімеона Полацкага), былы сабор Богаяўленскага манастыра XIII стагоддзя ў Полацку, храм абароннага тыпу ў вёсцы Камаі Пастаўскага раёна і многа іншых.

Аднак, узяць помнікі пад ахову гэта не проста занесці іх у нейкі спіс. Трэба па-гаспадарску клапаціцца аб іх, добраўпарадкоўваць навакольную тэрыторыю, ствараць ахоўныя зоны, даследаваць «біяграфію» архітэктурных збудаванняў, гістарычных мясцін, прапагандаваць гераічныя падзеі, звязаныя з жыццём і барацьбой нашага народа.

Шмат чаго ў гэтым напрамку робяць пярвічныя арганізацыі школ, навучальных устаноў, калгасаў і саўгасаў рэспублікі, якія замацаваны за ўсімі гістарычнымі мясцінамі і помнікамі.

Зараз, ідучы насустрач 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, мы актыўна прапагандуем ленінскія ідэі аб выкарыстанні культурнай спадчыны ў патрыятычным выхаванні працоўных, прапагандуем помнікі архітэктуры і культуры, рэвалюцыйнай, воінскай і працоўнай славы народа.

Прэзідыумы рэспубліканскага, абласных і гарадскіх саветаў таварыства разам з Камітэтам Савета Міністраў БССР па друку, упраўленнем па турызму Белсаўпрофа рыхтуюць даведнікі аб найбольш цікавых і памятных мясцінах рэспублікі. Хутка выйдзе з друку першы такі даведнік — «Выдатныя помнікі дойлідства Беларусі». У ім, акрамя апісання архітэктурных збудаванняў мінулага, ёсць добрыя ілюстрацыі. Гэтай зімой аматары падарожжаў па родным краі атрымаюць даведнік «Помнікі культуры Мінскай вобласці». Рыхтуюцца карты-даведнікі па маршрутах: Орша—Віцебск—Полацк, Гродна—Навагрудак — Мір, Гомель — Мсціслаўль, Брэст — Мінск.

З будучага года мяркуем выдаваць ілюстраваны інфармацыйны бюлетэнь. Выходзіць ён павінен не менш чатырох разоў у год. Атрымліваць яго змогуць не толькі пярвічныя арганізацыі таварыства, але і падпісчыкі.

Тое-сёе робяць па прапагандзе помнікаў гісторыі і культуры раённыя аддзяленні таварыства. Ужо сёлета на старонках мясцовых газет было надрукавана больш паўтысячы карэспандэнцый, артыкулаў аб помніках культуры, аб рабоце пярвічных арганізацый таварыства. А Барысаўскае, Гомельскае, Горацкае, Мінскае, Магілёўскае, Столінскае раённыя аддзяленні выпусцілі масавым тыражом плакаты аб мясцовых помніках культуры.

Аднак трэба адзначыць, што нашай прапагандзе помнікаў яшчэ бракуе баявітасці, настойлівасці. Каб усе ведалі і свята бераглі курганы і пасяленні старажытнага чалавека, архітэктурныя збудаванні, трэба каб помнікі «загаварылі» з трыбун кафедр, з экранаў кіно і тэлевізараў, са старонак газет і часопісаў. Калі мы гэтага даможамся, то, думаю, будзе менш выпадкаў разбурэння і знішчэння помнікаў гісторыі і культуры. На жаль, такія выпадкі яшчэ здараюцца.

Не так даўно ў Оршы разбурылі два былыя касцёлы, унікальныя помнікі архітэктуры, якія цудам збераглісь з часу сярэднявечча. Дзеля фармальнасці склалі акт аб аварыйным стане будынкаў. І хто, вы думаеце, яго падпісаў? Члены прэзідыума Аршанскага гарадскога савета таварыства галоўны архітэктар горада Г. Гаранскі, загадчык гаркамгаса І. Капылоў, супрацоўнік рэдакцыі раённай газеты І. Высоцкі, работнік райкома партыі Л. Парункевіч. Смяротны прысуд падпісалі якраз тыя асобы, якія закліканы былі ахоўваць гэтыя помнікі, якіх для гэтага і выбраў народ.

І гэты прыклад не адзіны. Не так даўно у Шарашове Пружанскага раёна знесена драўляная царква 1799 года, пабудаваная без адзінага цвіка.

Калі не ўзяць пад ахову, дык праз дзесяць гадоў у Беларусі не застанецца ніводнага ветранога млыну. Ужо зараз немагчыма знайсці курную хату—асноўную жылую пабудову на вёсцы канца XIX—пачатку XX стагоддзя на поўдні і заходнім поўдні рэспублікі. Гавару аб гэтым не таму, што мне шкада курных хат. Мне вельмі хацелася б, каб у будучым этнаграфічным музеі нашай рэспублікі былі сапраўдныя будынкі, прадметы быту. Каб праз сапраўдныя рэчы моладзь успрымала той уклад жыцця нашага народа, якім ён быў да Кастрычніцкай рэвалюцыі, і па-сапраўднаму магла б ацаніць тое, што мы маем цяпер.

Прэзідыум Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры рашыў у бліжэйшы час узяць на ўлік усе выдатныя творы драўлянай архітэктуры, каб захаваць для будучага лепшыя іх узоры, размясціць у музеях народнай архітэктуры і быту, у этнаграфічных музеях, якія, без сумнення, з'явяцца і ў нашай рэспубліцы. Такія музеі ёсць у Літве і Латвіі, Малдавіі і Грузіі, у Расійскай Федэрацыі, у Кіеве ствараецца Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту.

Вялікае будаўніцтва ідзе зараз не толькі ў гарадах, але і ў вёсках. Праектныя арганізацыі стараюцца, каб новыя будынкі размясціць, «прывязаць» як найлепш, каб чалавек, жывучы ў іх меў усе зручнасці. Аднак у асобных выпадках праекціроўшчыкі не лічацца з існуючымі помнікамі культуры.

Вось прыклады. У Гродна па вуліцы Карла Маркса знаходзіцца брыгіцкі манастыр і касцёл 1642 года. Побач з манастыром пабудаваны 5-павярховы будынак паштамта, які закрывае комплекс манастыра. У занёманскай частцы горада побач з помнікам архітэктуры XVII стагоддзя францысканскім манастыром узводзіцца пяціпавярховы будынак бальнічнага корпуса, які закрые заходні (асноўны) фасад гэтага архітэктурнага помніка. Па плану рэканструкцыі Гродна, які распрацаваў Белдзяржпраект у 1963 годзе, прадугледжваецца «раскрыць» у бок вуліцы Ажэшкі паўкруглую плошчу Леніна. Але як? Шляхам зносу палавіны будынкаў, пабудаваных на рубяжы XVIII—XIX стагоддзяў, якія ўтвараюць гэтую плошчу.

А вось аўтары праекта забудовы і рэканструкцыі Гомеля пастараліся зрабіць так, каб размешчаны на правым беразе Сожа парк культуры і адпачынку імя А. Луначарскага, у якім знаходзіцца многа помнікаў архітэктуры, кампазіцыйна ўпісаўся ў новую забудову цэнтра горада. Былы палац Паскевічаў з'яўляецца адной з дамінант у забудове цэнтра і галоўным акцэнтам у планіровачнай структуры горада. Будынкі былога сабора Пятра і Паўла, паляніўчы домік, капліца і магільны склеп Паскевічаў—усё ўлічана пры складанні праекта планіроўкі і забудовы набярэжнай ракі Сож. Тут вырастуць будынкі павышанага тыпу (9—14 паверхаў). Але яны не будуць прыніжаць каштоўнасці помнікаў архітэктуры.

Заканчваючы артыкул, хочацца яшчэ раз звярнуцца да нашых сучаснікаў — архітэктараў, будаўнікоў, усіх, хто прымае ўдзел у стварэнні новых гарадоў: калі хочаце, каб нашчадкі паважалі вас, паважайце сваіх папярэднікаў. Бо будучыя пакаленні абавязкова спытаюць: «А што вы зрабілі, каб захаваць культурныя багацці Радзімы?»

Ф. БАРЫСЕВІЧ,

намеснік старшыні прэзідыума цэнтральнага савета Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

ШАСНАЦЦАЦЬ ПУЦЁВАК НА ВОСТРАЎ СВАБОДЫ

НА МІНУЛЫМ тыдні ў беларускай сталіцы гасцявала дэлегацыя гераічнай Кубы на чале з першым сакратаром Кубінскага пасольства ў Маскве тав. Мануэль Лефранам Крыстам. У складзе дэлегацыі былі работнікі пасольства, супрацоўнікі часопіса «Куба», які выдаецца ў СССР на рускай мове. Госці сталіцы сустрэліся з журналістамі, студэнтамі, рабочымі, наведалі Брэсцкую крэпасць, мемарыял Хатынь, Курган славы і іншыя памятныя месцы беларускага народа.

Карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» сустрэўся з прадстаўніком часопіса «Куба» Мануэлем Пасо.

— Не маглі б вы сказаць нашым чытачам, якая мэта вашага прыезду на беларускую зямлю?

— Вось ужо пяць гадоў, як выдаецца наш часопіс «Куба» на рускай мове. Тэрмін, вядома, невялікі, яго юбілеем не назавеш. Аднак мы змаглі пераканацца, што і за гэты нязначны адрэзак часу набылі дзесяткі тысяч сяброў у Савецкім Саюзе і, у прыватнасці, у вашай рэспубліцы.

Вось мы і прыехалі для таго, каб бліжэй пазнаёміцца з вашай рэспублікай і яе народам.

— Якое месца на старонках вашага часопіса займаюць літаратурныя творы?

— Я думаю, што ваша пытанне не выпадковае. Нешта падобнае чулі мы ў пісьмах нашых чытачоў. Нас гэта вельмі радуе. Мы — маладая дзяржава. І хоць у нас няма такіх вялікіх літаратурных традыцый, як у вашага народа, мы надаём гэтаму вялікае значэнне. Нашы чытачы ўжо не раз маглі пазнаёміцца на старонках «Кубы» з творамі маладых кубінскіх паэтаў і празаікаў. У апошні час мы ўсё шырэй прадстаўляем магчымасць друкавацца многім прагрэсіўным пісьменнікам не толькі нашай рэспублікі, але і ўсіх краін Лацінскай Амерыкі. Напрыклад, зараз мы рыхтуем да друку ўрыўкі з запісак перуанскага пісьменніка Дон Фернанда Орціса, які прысвяціў іх нашаму нацыянальнаму герою Эрнеста Чэ Гевара.

І яшчэ хачу сказаць некалькі слоў аб тым, як любяць і паважаюць у нас у краіне савецкую літаратуру. Чытаюць усе — рабочыя, студэнты, служаныя, воіны. Вы, вядома, памятаеце тыя дні, калі амерыканскі імперыялізм паспрабаваў задушыць нашу маладую краіну. Тады на Плайя-Хірон у паходных мяшках нашых «барбудас» разам з патронамі і гранатамі былі дзве кнігі— аб гвардзейцах-панфілаўцах і аб абаронцах Брэсцкай крэпасці. Героямі гэтых кніг горача любіць наш народ.

Мы вельмі шкадуем, што пакуль яшчэ не паспелі як належыць пазнаёміцца з беларускай літаратурай. Аднак прымаюцца меры да таго, каб кубінскі чытач як мага хутчэй мог пазнаёміцца з творчасцю вашых пісьменнікаў.

— Хацелася, каб вы больш падрабязна расказалі аб конкурсе вашага часопіса, які праводзіцца ў СССР.

— Мэта, асноўная задача нашага часопіса — умацаванне і зближэнне нашых народаў. Гэтай мэце служыць і праваядзенне конкурсу. Нам будзе вельмі прыемна, што савецкія людзі змогуць бліжэй пазнаёміцца з нашым жыццём.

Для пераможцаў мы ўстанавілі 16 прэмій — на кожную саюзную рэспубліку. Прэміі — гэта пуцёўкі на нашу зямлю. Паездка адбудзецца ў ліпені 1970 года, калі ўвесь кубінскі народ вялікім святам адзначыць выкананне сваіх беспрэцэдэнтных эканамічных абавязацельстваў. І яшчэ—гэта час нашых славутых карнавалаў, на якіх выступяць і вашы савецкія артысты.

Апошні тэрмін нашага конкурсу — 30 красавіка 1970 года.

Напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ў многіх школах Брэсцкіны арганізоўваюцца ленінскія пакоі, музеі, куткі. На гэтым здымку вы бачыце педагога сярэдняй школы № 8 г. Брэста Марыю Іванаўну Сушко з сямікласнікамі за абмеркаваннем афармлення ленінскага пакою.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую работу ва ўстановах культуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння дырэктар Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Міхалюта Іван Францавіч узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ВЫТВОРЧАСЦЬ І ЭСТЭТЫКА

ВОПЫТ ПАДКАЗВАЕ

А. МОРСАЎ,

начальнік Бюро тэхнічнай эстэтыкі Мінскага гадзіннікавага завода.

СЁННЯ наўрад ці стане хто падвяргаць сумненню мэтазгоднасць тэхнічнай эстэтыкі або народжанай яе патрабаваннямі навукі эрганомікі, якая даследуе і вызначае ў сацыяльным і псіхалагічным плане развіццё ўзаемаадносін паміж чалавекам і вытворчасцю.

Многім практычным захадам у гэтай галіне, якія падказвае нам набыты за апошнія гады вопыт, часам замінае ўяўленне, быццам тэхнічная эстэтыка — гэта звонку навязанае вытворчасці «ўпрыгожвальніцтва», мала звязанае з надзённымі задачамі нашай эканомікі.

Некалі, на ранняй стадыі развіцця грамадства, рамеснікі так ці інакш мелі магчымасць выяўляць свае пачуцці і разуменне прыгажосці. Тагачасныя вырабы нярэдка пераходзілі мяжу утылітарнага — прадметы рамесніцкай вытворчасці ўзнімаліся іншы раз да ўзроўню твораў мастацтва. З прыходам машыннай вытворчасці утылітарызм і тэхніцызм змёў праявы эстэтычнага ў сферы вытворчасці. Але гэта было часова. Голы канструктывізм не мог не завесці вытворчасць у тупік, з якога яе магла вывесці толькі дарога пошукаў прыгажосці як у саміх прамысловых вырабах, так і ў вытворчым асяроддзі. Нараджэнне дызайна быццам вярнула чалавека да творчасці паводле законаў прыгажосці, але ўжо на новым узроўні—адпаведна патрабаванням сацыяльнага і тэхнічнага прагрэсу.

Выкананне нават самых элементарных патрабаванняў тэхнічнай эстэтыкі — пошукі рацыянальных форм і габарытаў прылад працы і абсталявання, навукова абгрунтаваная афарбоўка станкоў, памяшканняў, дзе працуе чалавек, і да т. п.— дае адчувальныя вынікі: работы менш стамляецца, расце прадукцыйнасць працы, павышаецца якасць прадукцыі.

А душа тэхнічнай эстэтыкі, між тым, не ў адных названых тут элементарных патрабаваннях, звязаных, можа, хутчэй проста з культурай вытворчасці. Яна перш за ўсё ў арганічнай сувязі творчай думкі канструктара і мастака.

Справа, здавалася б, ясная. Даўно павінны былі б адысці ў нябыт спрэчкі на прадпрыемствах, дзе працуюць мастакі-канструктары, паміж імі і кіраўнікамі. Але спрэчкі ўсё ж узнікаюць. І па той толькі прычыне, што кіраўнікі (нават з вялікім вопытам работы на вытворчасці), бывае, недаацэньваюць работу мастакоў-канструктараў або Бюро тэхнічнай эстэтыкі. Да іх патрабаванняў часам ставяцца пагардліва. І многія карысныя пачынанні, многія каштоўныя ідэі гінуць па прычыне недастаковай кампетэнтнасці «арбітраў» спрэчак.

НА МІНСКІМ гадзіннікавым заводзе ў галіне тэхнічнай эстэтыкі зроблена і робіцца не так ужо і мала. Тут у 1967 годзе створана Бюро тэхнічнай эстэтыкі. Яно ўваходзіць у сістэму аддзела навуковай арганізацыі працы. Спецыялісты па тэхнічнай эстэтыцы ўдзельнічаюць у рабоце над новым нестандартным абсталяваннем (прыборы, станкі, арганізацыя рабочых месц спецыялістаў рознага профілю), распрацоўваюць эскізы рэканструкцыі цэхаў на аснове норм тэхнічнай эстэтыкі, кантралююць усе віды ўнутрызаводскіх работ па рэканструкцыі і пераабсталяванні. На заводзе створаны савет па тэхнічнай эстэтыцы. На чале савета—галоўны інжынер завода. У савет уваходзяць галоўны канструктар, начальнікі цэхаў і аддзелаў. Па меры завяршэння работ над эскізнымі праектамі Бюро тэхнічнай эстэтыкі збіраецца савет, на якім гэтыя праекты абмяркоўваюцца і зацвярджаюцца. Затым распрацоўваецца канструкцыйная частка разам з інжынерамі-канструктарамі, а тады ўжо праект ідзе ў работу—выконваецца ў матэрыяле.

Вельмі шкада, што нярэдка дзейнасць Бюро тэхнічнай эстэтыкі на месяц-паўтара паралізуецца—яно скарыстоўваецца як чыста афарміцельская арганізацыя па святочным афармленні завода і тэрыторыі вакол яго. Такое становішча і на іншых прадпрыемствах, дзе няма спецыяльных груп па афармленні наглядная агітацыі і свят.

На нашым заводзе па эскізах бюро цалкам рэканструяваны трыба-колавы цэх. Разам з тэхнолагамі і канструктарамі работнікі бюро літаральна пераўтварылі інтэр'ер гэтага цэха. Зняты глухія фанерныя перамычкі. Замест іх пастаўлены блокі са шкла, стала больш святла і паветра. Старая асфальтавая падлога, наскрозь прапітаная машынным маслам, па эскізах бюро заменена новай — з каляровых цэментаў у спалучэнні з метлахскай пліткаю светлых таноў. Калі б на такой падлозе пакінуць станкі і абсталяванне ў старой афарбоўцы, дык яны глядзеліся б чорнымі плямамі. Значыцца, і станкі перафарбаваны. Я не кажу ўжо пра апорныя калоны і сцены. У інтэр'еры цэха ўлічаны ўсе дэталі. Распрацаваны спецыяльныя тумбачкі слесараў-наладчыкаў замест брыдкіх паўшафаў-паўскрынак з вялізнымі вісячымі замкамі. Пераабсталяваны рабочыя месцы камплектатараў. Шматсекцыйныя шафы для прыбораў і інструментаў завяршаюць новы ансамбль. У выніку рэканструкцыі ў цэху значна вырасла прадукцыйнасць працы, зменшылася цякучасць кадраў.

Па эскізах бюро афармлены інтэр'еры інфармацыйна-вылічальнага цэнтра завода, участка цыферблатаў. Распрацаваны і выкананы інтэр'ер цэнтральнага дыспетчарскага пульта.

[Заканчэнне на 3-й стар.].

ПАМЯЦІ АДАМА БАБАРЭКІ

Капыльшчына ўрачыста адзначыла 70-годдзе з дня нараджэння свайго выдатнага земляка Адама Антонавіча Бабарэкі. Напярэдадні юбілею раённая газета «Слава працы» змясціла ўспаміны Уладзіміра Дубоўкі, Кандрата Крапівы, Максіма Лужаніна, а таксама жонкі крытыка — Ганны Іванаўны. Жыццю і творчай дзейнасці А. Бабарэкі прысвяціў свой артыкул кандыдат філалагічных навук У. Конан.

18 кастрычніка ў вёсцы Слабада-Кучынка, дзе нарадзіўся паэт, адбылося ўрачыстае пасяджэнне. У ім прынялі ўдзел рабочыя саўгаса «Крыніцы», інтэлігенцыя, родныя і блізкія пісьменніка.

Уступнае слова пра выдатнага літаратара і першага свайго настаўніка сказаў старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета А. Кандыбовіч. Настаўніца мясцовай школы Г. Нагавіцына зрабіла даклад аб творчым шляху Адама Бабарэкі. Дырэктар мясцовай школы І. Трацельскі, намеснік рэдактара раённай газеты Р. Швец, кандыдат філалагічных навук У. Конан у сваіх прамовах падкрэслілі значэнне дзейнасці і творчасці Адама Бабарэкі для развіцця беларускай літаратуры.

На ўрачыстым пасяджэнні было прынята рашэнне прасіць адпаведныя органы прысвоіць мясцовай школе, першым дырэктарам якой быў Адам Бабарэка, яго імя.

А. СІДАРОВІЧ.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Сёлета Дзяржаўны рускі тэатр БССР імя М. Горкага пачаў сезон паказам дзвюх прэм'ер — пасля «Толькі аднаго жыцця» А. Маўзона калектыў пазнаёміў мінчан з творам сучаснага французскага драматурга Жана Ануя «Вандроўны без багажа», першай п'есай гэтага аўтара пастаўленай у нашай рэспубліцы.

Творчасць яго супярэчлівая: сам Ж. Ануй часта дэкларуе сваю «апалітычнасць», аднак сярод яго п'ес ёсць значныя творы з выразным антыбуржуазным напрамкам, ён выкрывае свет багатых і сцвярджае права прыгнечаных на шчасце.

Спектакль «Вандроўны без багажа» паставіў заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Даброцін, мастак — заслужаны дзеяч мастацтваў Каз. ССР В. Галубовіч, кампазітар — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Г. Вагнер. Ролі на прэм'еры іграли народная артыстка БССР Г. Абуховіч, заслужаныя артысты рэспублікі І. Лакштанава, А. Шах-Парон, Ю. Сідараў, акцёры І. Камароў, Ю. Сцяпанаў, З. Асмалоўская і іншыя.

На здымку — сцэна са спектакля: у ролі Гастона І. Камароў, мадам Рэно — Г. Абуховіч.

Тэатр юнага гледача паказаў мінчанам новы спектакль — драматычную навелу «Палёт» Ул. Мехава. Спектакль прысвечаны памяці адважных лётчыц, дзяўчат, якія ў гады вайны ўзялі ў рукі штурвал баявой машыны і змагаліся з ворагам, штурмуючы з неба пазіцыі і камунікацыі праціўніка. Правобразам гераіні была Галіна Дакутовіч.

Герой Савецкага Саюза Н. Папова праз праграмку спектакля звяртаецца да юных гледачоў: «Пра такіх, як Галя Дакутовіч і тысячы яе равесніц, што ў грозную для Радзімы часіну сталі адважнымі салдатамі, і нагадвае спектакль «Палёт». І яшчэ пра тое, як жывуць яны ў нашай памяці, у нашых справах, у нашых думках...» На сцэне дзейнічаюць чатыры чалавекі — Валя (артыстка В. Кліменка), Жэня (Ж. Друцкая), Павел (Ул. Баклейчаў) і Расціслаў (В. Мельнікаў). На здымку — сцэна, дзе Валя і Павел перажываюць радасць: стала вядома, што дзяўчыну прадстаўляюць да ўзнагароды...

Спектакль паставіла рэжысёр Л. Тарасава пад мастацкім кіраўніцтвам галоўнага рэжысёра тэатра Б. Ганагі ў дэкарацыях, зробленых па эскізах мастака В. Тарасава. Музыка кампазітара С. Картэса.

З БЛАКНОТА ЖУРНАЛІСТА

НЕПАТРЭБНАЯ СПАДЧЫНА

Наша Алешня доўгая — дваро́ў каля трохсот. Ад Крывой Слабады праз Прылёпаўку і Катаўку аж да самага Засінніка (гэта накшталт мікрараёнаў) вярсты тры. Але так ужо вядзецца спрадвеку—кожны кожнага ведае, усе нібы свае.

Вось члапае насустрач мая сваячка Наста Малалецікава. Ідзе яна з сынам Толікам, у руках вядзерца з венікам, скамчаны ручнічок. Сама басаножа, Толік — у сандаліках. Цікава, адкуль гэта яны шыбуюць?

— З лазні, — усміхаецца Наста. — Сама памылася ды во гэтага карапуза папаласкала.

— А чаго ж босая?

— Так здаравей. А што пясок, дык занач абсыплецца.

І прыпомнілася мне, як надоечы завітаў да Насты дахаты. Падлога жоўтая, вышараваная дзеркачом. Печ завешана паркалёвай шырмай, вокны — фіранкамі, на стале белы абрус. Прыгожа засланыя пасцелі з гарамі падушак. У дастатку, відаць, жыве Наста, хапае чаго адзець-абуць. А вось жа ходзіць босая...

Вунь Амяльян Мінянкоў чакае «пасажырскі». У сетцы яго боханы хлеба, качаны капусты. Мусіць, з магазіна. Гадоў колькі назад мы дабіраліся пешкі да магазіна ў Журавічы кіламетраў за дзесяць. А тут паўвярсты нейкае, а ўжо паляе дзядзька Амяльян, каб падскочыць на аўтобусе аж пад самую хату.

Расказвалі мне, як аднойчы на брыгадным сходзе «закаціў» Мінянкоў такую прамову:

— Жывём мы цяперака, людцы, добра, культурсцвенна. У кожнай хаце салаўі спяваюць...

Нехта не вытрымаў тады, выкрыкнуў з залы:

— Пра якіх гэта вы, дзядзька, салаўёў гаворыце? Ці не пра тых, што ў вас пад печчу цвыркаюць?

Збянтэжылі чалавека, не далі душу выліць. Не ўсім, аказваецца, падабаецца цяперашняя вясковая культура быту. Сусед мой, дзядзька Хведар, ацэньвае дасягненні амаль гэтак, як і Мінянкоў, на «пяцёрку»:

— Гэта ж было пасля вайны такое, што на стале стаяў адзін толькі чыгун з бульбай, добрага чалавека дык і прыняць не было чым, ні відэльца, табе ні талерачкі. А цяпер у маёй кабеціны і то цэлая куча начыння ўсякага ды фарфору, бі — не пераб'еш. Я, праўда, не вельмі ахвотнік відэльцам есці. Марока адна. Відэльцы тыя для гасцей. Але ж, кажу, калі параўнаць, то далё-ё-о-ка мы з гэтаю культураю пайшлі!...

А сусед дзядзькі Хведара Уладзімір Сысоў падколвае дзядзьку Хведара, што далёкі ён ад культуры чалавек. Бо нашто было мазаць дзёгцем вароты ды яшчэ пахваляцца: во які знайшоў паратунак ад сырасці, а то пагнілі б...

— Культура... — не можа супакоіцца Сысоў. — Хіба культура — гэта адны тэлевізары, матацыклы, радыё, электрыка? А паглядзіце, што ў нас на стол падаюць. Не гасцям, а сабе, штодзень. На абед — дзве першыя стравы—капусту і крупнік. На сняданак і вячэру — кіслае і салодкае малако, агуркі, сала, бульбу. А з гэтых жа прадуктаў, умеючы, дзесяткі страў можна згатаваць. Але — умеючы! Нашы ж гаспадыні не ўмеюць, і не ведаю,ці навучыць іх хто калі...

Так, сервіроўка стала ў нас самабытная, ледзь не анекдатычная. Калісьці сям'я пастуха Міхася Сысова жыла ў нястачы. Сям'я вялікая, восем душ. Пракармі, апрані. Цяпер Сысоў жыве ў дасатку. Пабудаваў вялікі дом-пяцісценку. Дзеці пагадаваліся, раз'ехаліся. Часам з'язджаюцца пагасціць да бацькоў. Радуюцца: дом у бацькі, што цацка. Але заходзяць у сярэдзіну — што гэта? Ложкі і зэдлікі са старой хаціны, куфар, паточаны шашалем, бы хто з драбавіка прастрэліў, рыпучы стол у кутку. У сенцах — цабры, карыты, хмара мух...

Частуе бацька дзяцей. Сала і хлеба нарэзана, навалена на стол вялікімі кавалкамі (не бедныя!), да гарэлкі падаюцца абавязкова шклянкі (хапае гэтага дабра, госцікі, не шкадуйце!), талеркі кіслага малака і смятаны, куча непарэзанай радыскі, проста на абрус высыпана сопкая бульба (ешце на здароўе, не куплёнае ж!). Няма відэльцаў і талерачак на кожнага, няма сурветак, нават ручніка на калені не прапанавалі (выбачайце, госцікі, калі што не так, мы ж не гарадскія!)

Кантрасты, кантрасты...

Ціхім, духмяным вечарам чуваць над сялом песні. Кожны пазнае голас Наталкі Ягоравай. А голас-голас! Кожнае слова—звініць! Спяваюць дзяўчаты пра Ладу, пра апошнюю электрычку, пра брыгаціны, якія стаяць на рэйдзе. Рэдка хто надумаецца, і то з больш сталых, праспяваць матчыну — пра каваля маладога, пра агурочкі. Маладыя адразу заўсміхаюцца: во, ці не «на корак наступілі». І ніяк не зразумець ім, што ў сваім наіўным «бунтарстве» супраць старога, яны, як кажуць, выплюхнулі разам з вадою і дзіця, бо многія песні нашых матак і бацькоў вечна маладыя, напоўнены высокімі думкамі і пачуццямі, каштоўнасць якіх ніколі не зменшыцца, не згасне. Бо ў іх — душа народа, бо ў іх шматвекавыя вопыт і чалавечая мудрасць.

Аднаго разу завітаў у клуб студэнт, наш алешанскі хлопец, які быў на канікулах. Зняў капялюш, а яго — на смех паднялі:

— Ты што — у царкву прыйшоў?

Пад нагамі шалупінне гарбузікаў, сланечніка. Сядзяць усе ў шапках, ватоўках. Але хто? Зноў жа тыя падлеткі або сталыя мужчыны. Дым, як ладан.

І тут жа ўспамінаецца, як аднойчы прыехалі з Мінска артысты. Вечарам апусцела вёска — усе падаліся ў клуб. Цікава ж, падзея на ўвесь год! І ў зале — вужака не пралезе, зашчэміцца, пад вокнамі—як насыпана жэўжыкаў-падшыванцаў. Здаецца, адкуль той і моладзі набралася ў Алешні! Ва ўсё лепшае апрануты — быццам на вяселле прыйшлі. Дзяўчаты — ў мініспадніччках, але... у хустках пад бараду, хлопцы — у адмысловых гарнітурах, нават з транзістарамі, але ўключаюць іх калі трэба і калі не трэба, перашкаджаюць слухаць...

Як далёка, аказваецца, сялянская заможнасць ад этыкі і эстэтыкі, ад сапраўднай культуры быту! Дык што трэба рабіць і каму рабіць, каб «пяцёрку» цяперашняму вясковаму жыццю стаўлялі не толькі Амяльян Мінянкоў ды дзядзька Хведар, а хаця б і Уладзімір Сысоў?

У вёсцы цяпер, дзякуй богу, грамацеяў хапае. Настаўнікі, аграномы, эканамісты, інжынеры, медыкі, культасветработнікі. Але во дзіва: зойдзеш на кватэру да калгасніка ці да каго з іх — то амаль ніякай розніцы не ўбачыш. Жывуць цяпер калгаснікі не бядней за сельскую інтэлігенцыю: і на працадні няблага атрымліваюць, і ў кожнага гаспадарка — каровы, свінні, птушка, сад, агарод. На ашчадных кніжках у некаторых грошай столькі, што такіх той жа настаўнік і не сніў. Можна сказаць, эканоміка селяніна і сельскага інтэлігента ўрэшце прыраўнялася. А вось з культурай пакуль што няважна і ў тых, і ў другіх.

У каго ж тады пераймаць селяніну навуку — як жыць культурна? Ці не мог бы настаўнік перадаць алешанскаму жыхару хоць бы тое, што ведае сам? Мог бы, яшчэ і як мог бы! Але...

«Разумееш, браце, — прызнаўся мне адзін алешанскі настаўнік, — калі трапляю ў гарадскую кампанію, дык нават не магу ўспомніць, у якой руцэ нож ці відэлец трымаць — сорамна!»

На жаль, у Алешню і зараз прыязджаюць такія выпускнікі вну і тэхнікумаў, якія апрача ведаў па сваёй спецыяльнасці ні ў чым больш не разбіраюцца. І ўжо не ён навучыць, а яго трэба «наломваць», як, скажам, па-сучаснаму абсталёўваць кватэру, сервіраваць стол, прымаць гасцей. Не прадугледжана гэта ні ў школьных праграмах, ні ў вузаўскіх ці тэхнікумаўскіх. Добра, калі ёсць факультэт грамадскіх прафесій і там «нахапаецца» трохі чаго, а калі няма (і гэта характэрна для большасці навучальных устаноў), то прыязджаюць такія выпускнікі з вельмі мізэрным багажом.

Вядома, не ўсе нашы настаўнікі такія. Многія а іх маюць не малы запас патрэбных ведаў, маглі б многаму навучыць не толькі малых, але і дарослых алешанцаў. Маглі б...

Праўленню арцелі з-за гаспадарчых спраў не да настаўнікаў, партыйнай арганізацыі таксама «галава не баліць», асноўны клопат партбюро — выхаванне камуністаў. Савет клуба сочыць толькі, каб рэгулярна дэманстраваліся фільмы ды займаліся самадзейныя артысты. І нікога не турбуе, што ўбаку настаўнікі, сельская інтэлігенцыя, што даўно ўжо трэба вырашыць праблему культуры комплексна, глыбока, усебакова. І пачынаць у першую чаргу з культуры быту.

Час цяпер такі настаў. Жыць калгасніку па-старому ўжо сорамна, нельга. Гэта разумеюць нават самі вяскоўцы, многія сельскія інтэлігенты. Але сіла інерцыі, нейкая душэўная абыякавасць перашкаджаюць ім атрэсціся ад гэтай спячкі-здранцвення, адчуць сябе змагарамі за новы быт і культуру, прапагандыстамі ўсяго лепшага, што дасягнута ў горадзе. Не прыладкоўвацца трэба да таго, што быту на вёсцы, а самім ісці наперадзе, весці за сабою.

Пачынаць можна было б, напрыклад, са спаборніцтва і конкурсаў на лепшы двор і кватэру, заняткаў розных гурткоў, універсітэта культуры, цікавых вечароў пытанняў і адказаў, дэманстрацыі мод, лекцый, дакладаў і гутарак настаўнікаў, медыкаў, дзеячоў культуры і мастацтва. Ды ці мала пры жаданні можна прыдумаць форм і метадаў уздзеяння і выхавання, ці мала можна знайсці пунктаў для прыкладання ведаў і здольнасцяў нават тых культурных сіл, што зараз ёсць на сяле!

А тады ўжо, як кажуць, культура будзе любіць культуру, абуджаная цікавасць, атрыманыя веды і навыкі будуць памагаць калгаснику будаваць свой быт па-новаму. З іх асяроддзя вылучацца свае лідэры і застрэльшчыкі новага. На вёсцы ж хутка пераймаецца кожная навінка ў побыце. Але няйначай, як пасля таго, калі селянін сам пераканаецца ў карысці і перавазе новага. Толькі трэба калгаснику памагчы ў гэтым.

Пакуль жа мая Алешня жыве, як і іншыя навакольныя вёскі, старымі звычкамі, дзедаўскімі традыцыямі. Падпраўленымі, падноўленымі, але старымі.

Звычнае, спрадвечнае — мацней за ўсё. Не лёгка з ім развітацца: гэта не рукавіца, з рукі не скінеш.

І ўсё ж развітвацца з ім трэба. Пара ўжо, мне здаецца, непатрэбную спадчыну здаць у музей этнаграфіі. І дапамагчы гэта зрабіць вёсцы можа толькі сельская інтэлігенцыя.

В. ГРОДНІКАЎ.

Рагачоўскі раён.

СЕМІНАР ПА ЗЯЛЁНАЙ АРХІТЭКТУРЫ

Праблемам ландшафтнай архітэктуры быў прысвечан семінар, які адбыўся 23—24 кастрычніка ў Саюзе архітэктараў БССР. Разам з архітэктарамі Мінска ў ім прынялі ўдзел спецыялісты па зялёнаму будаўніцтву з Гомеля, Брэста, Віцебска і іншых гарадоў рэспублікі.

«Ландшафтная архітэктура ў раённай планіроўцы» — на гэту тэму адбылася размова ў адной з майстэрань інстытута «Белдзяржпраект». Ландшафтнай архітэктуры вёскі была прысвечана сустрэча ў «Белгіпрасельбудзе», ландшафтнай архітэктуры месц масавага адпачынку — сустрэча ў інстытуце «Мінскпраект».

Удзельнікі семінара праслухалі лекцыі «Вучэнне аб геаграфічным ландшафце як навуковае абгрунтаванне функцыянальнага занавання». «Праблемы гарадскога ландшафту», «Ахова прыродных рэсурсаў».

У рабоце семінара прынялі ўдзел галоўны архітэктар лесапаркавай зоны Масквы Б. Табілевіч і выкладчык МДУ, кандыдат геаграфічных навук Е. Смірнова.

Удзельнікі семінара азнаёміліся з забудовай месц масавага адпачынку працоўных беларускай сталіцы.

БЕЛТА.

ЗАВОДСКІ ЖЫВАПІСЕЦ

У цэху выпрацоўкі шкла Гомельскага шклозавода імя М. В. Ламаносава ўсю плошчу тарцовых сцен запоўнілі пано «Лебядзінае возера» і «Зіма». Яны выкладзены з каляровай пліткі, вытворчасць якой асвоена на прадпрыемстве. У верхнім аддзяленні гэтага ж цэха з'явіліся пано «Дарогай працоўнай і баявой славы», розныя плакаты.

Усе гэтыя карціны выкананы па эскізах заводскага мастака У. С. Камоўскага.

На адным з вытворчых карпусоў па эскізах заводскага мастака выкладзен велізарны мазаічны партрэт У. І. Леніна.

Мастак прысвяціў ленінскай тэматыцы рад твораў. Яны занялі месцы ў чытальнай зале заводскага Дома культуры, у цэхавых чырвоных кутках.

Па эскізу заводскага мастака на тэрыторыі прадпрыемства ўстаноўлен помнік шклозаводцам, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Адзін з помнікаў савецкім воінам па яго эскізу ўстаноўлен недалёка ад завода, на абочыне шашы Гомель—Доўск.

Шмат працы і творчага натхнення Уладзімір Сільвестравіч са сваім памочнікам і вучнем Уладзімірам Кароткім уклалі ў стварэнне і мастацкае афармленне «Пакоя баявой і працоўнай славы гомельскіх шкларобаў».

БЕЛТА.

Тэатр *Рэпартаж*

ТВАЁ ЖЫЦЦЁ, СПЕКТАКЛЬ

ТВОРЫ мастацтва, як і людзі, адзначаюць дні свайго нараджэння, і ў іх таксама бываюць юбілеі. Такі спектакль Тэатра юнага гледача «Дзеці аднаго дома»—калектыў ўжо святкаваў адну дату ў яго сцэнічным жыцці, з нагоды пяцідзесятага паказу гледачам. Для арыгінальнай п'есы, напісанай спецыяльна для гэтай трупы артыстаў, — гэта і сапраўды свята. Спектакль і надалей прыцягвае ўвагу юных гледачоў. А для выканаўцаў роляў тое свята адшумела, і яны кожны раз, пачынаючы грыміравацца, зноў абдумваюць, як ім захаваць знойдзенае раней і нешта ўдакладніць, дамаляваць у вобразах, перадаць ва ўсёй непасрэднасці думкі і пачуцці герояў. Трэба іграць так, каб гэта было цікавым зразумелым і для ружавашчокага вучня, і для сівога ветэрана вайны, які разам з унукам сядзіць у зале і глядзіць на тое, што апаліла яго юнацтва...

Мы звярнуліся да ўдзельнікаў спектакля і да гледачоў з просьбай падзяліцца ўражаннямі, з якімі яны пакідаюць тэатр пасля спектакля. Вось што нам расказалі.

У. ГОВАР-БАНДАРЭНКА, заслужаны артыст БССР:

— Гэта—наша другая сустрэча з Шамякіным-драматургам. Некалі тэатр з поспехам іграў яго першую, здаецца, п'есу «Не верце цішыні».

Калі мы чыталі «Дзяцей аднаго дома», у многіх артыстаў было такое пачуццё, што Іван Шамякін упэўнена выпрацоўвае свой драматургічны почырк, і нам тут ёсць што іграць. І спектакль пацвердзіў гэтыя нашы думкі—на сцэне жывуць і дзейнічаюць цікавыя характары, а сюжэт развіваецца востра. Чаму я звяртаю ўвагу на сюжэт? Для нашага гледача гэты кампанент спектакля мае надзвычай важнае значэнне: наша аўдыторыя любіць сачыць за прыгодамі герояў. І Шамякін дае ім магчымасць пахвалявацца, захапіцца падзеямі. А ўзрушаны глядач лепш успрымае і ідэйную сутнасць твора. Ну, вядома, ён тады і недахопы не так заўважае...

Я іграю роль старога лесніка-партызана. Вобраз для мяне не новы: такія ролі даручаюць мне часта. У шамякінскай драме гэты чалавек мае і нешта адметнае—у мове, у разважлівым характары... Не ведаю, ці добра ў мяне атрымалася, але я і стараўся раскрыць у лесніку непаўторныя рысы. А гэта азначае, што кожную рэпліку вар'іруеш і так, і гэтак, каб знайсці свежую фарбу... Бывае, крыўдуеш на аўтара: маўляў, ён не «выпісаў» ролю, а часам і самога сябе вінаваціш за тое, што не заўважыў багацця нават у сухаватым тэксце... А ён мудры, гэты стары ляснік. Вось гэта я і шукаю ў ім, гэта іграю.

Аднак не скажу, што ў спектаклі мне падабаецца ўсё. На мой погляд, не вельмі выразнымі атрымаліся персанажы з варожага лагера і іх памагатыя. З такімі плакатнымі ворагамі лёгка «ваяваць»... на сцэне. Гэта, бадай, адзіны пралік аўтара і тэатра. Дарэмна мы спрашчаем у мастацтве напружанне паядынка нашых людзей з фашыстамі...

Хачу сказаць аб нашай творчай моладзі. Я многае бачыў за сваё тэатральнае жыццё. І мне вельмі прыемна, што мае цяперашнія маладыя калегі іграюць з агеньчыкам, шукаюць сапраўдную мастацкую праўду ў сваіх вобразах на сцэне.

С. БЯЛЕВІЧ, намеснік дырэктара тэатра:

— Па службе мне больш за ўсіх у тэатры даводзіцца сустракацца з гледачамі. Заўсёды цікава, як адносіцца глядач да нашых работ, ці падабаюцца яны яму, ці адкрываюць скарбніцы жыцця. Калі хочаце, я ў тэатры як той барометр. Ледзь што, акцёры адразу да мяне—«Ну, як нас прымалі, Соф'я Міхайлаўна?» — і гэта нягледзячы на тое, што і так адчуваюць кантакт з залай або, наадварот, адсутнасць яго.

Калі ў нас у рэпертуары з'явілася п'еса Івана Шамякіна «Дзеці аднаго дома», на мяне легла дадатковая нагрузка. Давялося стаць ледзь не паштальёнам. Пасыпаліся пісьмы гледачоў: пісалі школьнікі і воіны, студэнты і калгаснікі, партызаны і салдаты мінулай вайны. Гэта сведчыць пра тое, што спектакль хвалюе разнастайную аўдыторыю, закранае жыццёвыя праблемы. Гледачы вераць у праўду таго, што адбываецца на сцэне. Адзін дашкольнік, замест якога пісьмо напісала бабуля, выказаў сваю думку аб спектаклі так: «Ух і здорава далі фрыцам! Я б ім таксама ўсыпаў!..»

Разбіраючы пошту, якая паступіла ў тэатр пасля гастрольных паездак у Гомель і Гродна, радасна было пераканацца, што пастаноўка зусім не прайграла і ў выязным варыянце. Простыя і зручныя дэкарацыі мастака Б. Герлавана падабаюцца гледачам. Падабаюцца ім і вобразы, створаныя нашымі маладымі акцёрамі, выхаванцамі студыі пры Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы А. Кашперавым і Ул. Кошалем.

На Усесаюзным аглядзе спектакляў, прысвечаным 50-годдзю камсамола, тэатр атрымаў за спектакль «Дзеці аднаго дома» Ганаровую грамату ЦК ВЛКСМ.

Мы спадзяёмся на доўгае жыццё спектакля.

Галіна БАРТАШЭВІЧ, тэхнік завода імя С. Арджанікідзе:

— Здаўна хаджу я ў тэатр на вуліцы імя Ф. Энгельса. І цяпер, калі стала дарослай, хаджу да сваіх любімых тюгаўцаў. Зразумела, многае для мяне ў манеры ігры акцёраў і ў глыбіні раскрыцця жыццёвых з'яў цяпер... Ну, як гэта сказаць? Здаецца, наіўным, ці што. І «Дзеці аднаго дома» не пазбаўлены такой наіўнасці. Лёс выхаванцаў дзіцячага дома, якія трапілі ў лапы акупантаў, лёс хлопцаў і дзяўчынак, вымушаных амаль самастойна шукаць сродкі барацьбы, адстойваць нашу савецкую праўду — усё гэта падаецца з разлікам на юнага гледача, для якога вайна гэта старонка далёкага мінулага. Не ведаю, ці варта было спрашчаць такі канфлікт, але з падзякай скажу, што пакрыўе пэўную наіўнасць у сюжэце і ігры акцёраў перастаеш заўважаць і сочыш за сцэнай разам з суседзямі па крэслах, падзяляючы іх хваляванне. Цябе захоплівае агульны настрой сцэны і залы—і гэта добра. Праўда, я заўважаю, як некаторыя выканаўцы толькі знешне перадаюць унутраны стан герояў, дрэнна вымаўляюць тэкст, не захоўваюць, відаць, некалі добра распрацаваныя мізансцэны... Ці то прафесіянальны ўзровень зніжаецца ў іх, ці то я і на самой справе «перарасла» свой тэатр і стаўлюся да яго з празмерна высокімі патрабаваннямі. Такое ў мяне ўражанне пасля прагляду «Дзяцей аднаго дома». Трохі супярэчлівае. Магчыма, трапіла на не зусім удалае прадстаўленне. Ведаеце, бывае, артысты стаміліся, гледачы сабраліся «не тыя»...

П. ЦУРКАН, былы камандзір авіяцыйнага знішчальнага палка Ленінградскага фронту:

— Я памятаю час, адлюстраваны ў спектаклі «Дзеці аднаго дома». У тыя дні я служыў у эскадрыллі, якая прыкрывала з паветра «дарогу жыцця»—Ладажскае возера, — яна звязвала блакіраваны Ленінград з Вялікай зямлёй.

Аднойчы раніцай мы вылецелі на «свабоднае паляванне» ў раён Ладагі. Зрабіўшы некалькі кругоў над замёрзлым возерам, па якім звілістым ланцужком рухалася калона падвод з хлебам, ля самага гарызонту мы заўважылі шэсць маленькіх кропак, якія хутка набліжаліся да нас. Гэта былі варожыя «Юнкерсы», якія ляцелі бамбіць калону з хлебам.

Завязаўся няроўны бой. Мой вядучы з першага заходу збіў адзін самалёт, потым другі. У гэты час да мяне нечакана ў хвост зайшоў «Месершміт» і падпаліў мой самалёт.

Мне з вялікай цяжкасцю ўдалося пасадзіць машыну на ўзараны бомбамі лёд. З усіх бакоў да мяне беглі людзі ў кажухах, ватніках. Наперадзе ўсіх бег невысокі хлопчык з аўтаматам на грудзях. Крыху далей—другі, яшчэ меншы... Яны дапамаглі мне выбрацца з кабіны, пасадзілі на падводу. Потым, па дарозе на аэрадром начальнік атрада пазнаёміў мяне з імі. Заалі іх Гена і Вася. Што гэта былі за хлопцы! Хіба мог я падумаць, што кожны з іх ужо дзевяты раз пад бомбамі і артабстрэлам, прабіваючыся праз засады везлі каштоўны груз няскоранаму гораду. Гена быў двойчы паранены, страціў бацькоў, але трымаўся як сапраўдны герой.

Калі я глядзеў спектакль, шчыра гавару, — бачыў на сцэне іх—і Гену, і Васю, і сотні іншых хлапчукоў, якіх у вайну сустракаў і ў Брэсце, і ў Мінску, і пад Берлінам. Вобразы, створаныя ў спектаклі акцёрамі Ул. Мартынавым—Алёша, А. Кашперавым—Ізя, М. Пятровым—Ваня, Ул. Кошалем—Казімір запомніліся мне.

У тэатры я быў разам са сваім пятнаццацігадовым сынам. Потым, пасля спектакля, калі мы ішлі дамоў па начным горадзе, ён сказаў мне:

— А ты ведаеш, татка, нягледзячы ні на што, гэтыя хлопцы былі шчаслівыя. Шчаслівыя тым, што маглі змагацца. І я ведаю, што мы таксама змаглі б...

Мікалай ПОНТУС, выпускнік прафтэхвучылішча № 52:

— Калі глядач гаворыць, што тэатр яго ўсхваляваў, гэта ж не азначае, быццам ты прыняў твор цалкам і ў цябе няма заўваг! Наогул аднабакова меркаваць аб мастацтве не варта, відаць. Спектакль тюгаўцаў мне падабаецца, але ёсць і... «але».

Іншы раз, гледзячы на сцэну, ловіш сябе на думцы, што ўжо недзе сустракаўся і з героямі, і з падзеямі такімі. Мне чамусьці ўспомнілася кніга Асеевай «Атрад Трубачова змагаецца». І параўнанне з ёй будзе зусім не ў карысць спектакля «Дзеці аднаго дома». Там усё было цікавей, больш вобразна. Кожны герой, быў гэта сам Трубачоў, ці хлопцы з яго атрада, паказаны ў кнізе сакавіта, ярка, запамінальна.

Пакуль глядзіш спектакль, хвалюешся, а ў антракце раптам успамінаеш кнігі і фільмы, дзе пра такія ж падзеі і такіх хлопцаў гаворыцца на больш высокім мастацкім узроўні. Хто вінаваты—аўтар ці выканаўцы — не ведаю, але гавару пра гэта шчыра, як сталы тюгаўскі глядач...

Генадзь КУЧМЕЛЬ, студэнт вячэрняга аддзялення Мінскага радыётэхнічнага інстытута:

— У тэатры я бываю не вельмі часта. «Заядаюць» вячэрнія заняткі. Білеты на спектакль «Дзеці аднаго дома» набыў выпадкова. Сказалі, што гэта—пра вайну. А вайну я ведаю толькі па расказах маці ды па кінафільмах. У мяне загінулі бацька і брат, якіх я ніколі не бачыў. Таму на спектаклі хвалявуся. Іграюць акцёры праўдзіва і шчыра. Па-мойму, галоўная вартасць твора ў тым, што тэатр знаходзіць агульную мову з гледачом. Іван Шамякін дакладна перадаў эпізоды ваеннага жыцця.

...«Эпізоды ваеннага жыцця» — так назваў спектакль адзін з тых, з кім мы гутарылі. Не будзем аспрэчваць і такое жанравае вызначэнне спектакля «Дзеці аднаго дома».

Мне давялося не адзін раз глядзець яго і зайсёды я назіраў, як па рознаму ўспрымаюць падзеі на сцэне, скажам, вучні сёмага класа і студэнты, дарослыя людзі, якія ведаюць вайну, і падлеткі. Радуе тое, што тэатр пераконвае большасць з іх у тым, што драматургі і тэатр адлюстроўваюць сапраўднае жыццё, што за ўсім стаіць рэальная рэчаіснасць. Нават сярод не вельмі задаволеных узроўнем мастацкага ўвасаблення п'есы сустракаеш людзей, якія спасылаюцца на дакументы вайны, на факты, вядомыя ім з мемуараў партызанскіх важакоў, з архіўных крыніц. У гэтым рэпартажы я і паспрабаваў даць карцінку такіх сустрэч і гутарак з гледачамі «Дзяцей аднаго дома» ў пастаноўцы Тэатра юнага гледача.

Вік. САЛАЎЁЎ.

САЛДАЦКАЯ ПЕСНЯ

НА НАШАЙ зямлі слаўся дым вайны. Войскі з баямі адступалі на ўсход. Гэта быў цяжкі сорак першы.

Але і тады ў салдацкім страі была прапісана на правах правафланговага ПЕСНЯ. Яна ніколі не разлучалася з салдатам. Увосень сорак першага лёс закінуў мяне ў Саратаў. Там рыхтаваліся камандныя кадры. Кожную ноч ўзнімалі нас па трызозе: вораг бамбіў горад. Але людзі жылі сваім хоць і цяжкім, але поўным жыццём. Дымяліся заводскія трубы, працавалі тэатры, спартсмены гулялі ў футбол, дзяўчаты кахалі...

І кожную раніцу прыціхлыя вуліцы аглушала салдацкая песня. Мы ішлі строем і спявалі:

Вставай, страна огромная,
Вставай на смертный бой
С фашистской силой темною,
С проклятою ордой.

У час вайны нейкі час я знаходзіўся ў Баку. Аднойчы туды прыехаў паэт Аляксей Суркоў. Паслухаць франтавога паэта прыйшло вельмі многа аматараў паэзіі. Невялікая зала пісьменніцкага дома на вуліцы Хагані ледзь умяшчала ўсіх жадаючых. Паэт чытаў многія свае вершы, якія потым сталі песнямі. Сярод іх была і славутая «Зямлянка». У той час гэту песню спявалі ўсе—і дзеці і дарослыя. Ён напісаў яе недзе пад Масквой, калі ішло рашучае змаганне з фашысцкімі ордамі на подступах да сталіцы. Песня Суркова была і салдацкай песняй. Яна, як крылатая птушка, абляцела ўсе франты, заглянула ва ўсе сэрцы, удыхнула ў іх вялікую сілу.

З тых часоў прайшло многа гадоў, але па-ранейшаму адчуваю асаблівае хваляванне пры гуках бадзёрай, радаснай, як само жыццё, салдацкай песні. Ідуць у страі воіны, чакаючы вытатаўскі крок — і песня ляціць за імі...

Нядаўна мы прыехалі ў ваенны гарадок па сваіх журналісцкіх справах. Сасновы бор, што акружаў меднаствольным частаколам салдацкія казармы, неяк прыціх.

У штабе ўвесь час паглядвалі на запацелыя вокны. Неспакой штабнікоў можна было зразумець. На адзінаццаць намячаўся агляд салдацкай песні. А тут няма пагоды...

І ўсе ж нягледзячы на дождж, агляд салдацкай песні пачаўся роўна ў адзінаццаць. Песні былі розныя. Адны падабаліся больш, другія менш. Але ні адна з іх не пакінула абыякавых.

Если неожданно враги
посягнут на границу,
Встанут солдаты и грудью
пойдут защищать
Нашу Отчизну, которой
нельзя не гордиться,
Нашу родную, великую мать!

У кожным падраздзяленні ёсць свой запявала. З многімі я знаёмы. Вось малодшы сяржант А. Сяўрук. Малады яшчэ запявала. Яго папярэднік яфрэйтар В. Багдэль, закончыўшы службу ў арміі, паехаў дамоў. І вось цяпер запявае ў страі Сяўрук, добры механік-вадзіцель танка.

— Нядаўна мы новую песню развучылі, — пахваліўся малодшы сяржант Сяўрук, калі мы з ім гаварылі аб службе.

— Заспявайце, — папрасіў я.

— Не, вы лепш з аўтарам пагаварыце...

Лейтэнанта Анатоля Мікалаевіча Зеляненькага — аўтара новай песні—я сустрэў адразу ж, як толькі ён са сваімі падначаленымі вярнуўся ў падраздзяленне. Мы доўга гутарылі з маладым камандзірам.

— Вось яшчэ спрабую пісаць музыку, — збянтэжана прызнаўся лейтэнант. — Маю песню тут спяваюць. Хочаце паслухаць?

Там где реки, леса и озера,
Там, где ливни, где вьюги
метут,
И зимой и в осеннюю пору
Наши быстрые танки идут...

Вечарам я слухаў, як спяваюць гэту песню салдаты.

...Цёплы кастрычніцкі вечар. Шуршыць пад нагамі лісце. Я іду па гарадку. І мяне праводзяць песні, добрыя салдацкія песні.

Спят бойцы, а месяц светит.
В городке покой...
Где-то вспыхнули зарницы...
Пусть солдатам крепко
спится —
Завтра всех горнист разбудит
с утренней зарей.

М. ПЛОТНІКАЎ,
ваенны журналіст.

ЦІ ДРУКАВАЎСЯ «СЛОЎНІК...» І. ГРЫГАРОВІЧА?

У ГАЗЕЦЕ «Літаратура і мастацтва» за 2 красавіка 1960 года быў апублікаваны артыкул М. Улашчыка «Літаратурная спадчына Івана Грыгаровіча». У гэтым артыкуле паведамлялася, што навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН СССР А. Прэабражэнскі, працуючы ў Краснаярскім архіве, сярод іншых матэрыялаў адшукаў архіў гісторыка і лінгвіста Івана Грыгаровіча (1792—1852), і што гэты архіў перавезены ў Маскву ў Цэнтральны музей літаратуры і мастацтва.

У архіве, сярод іншых матэрыялаў, захаваўся рукапіс слоўніка беларускай мовы, складзенага Іванам Грыгаровічам.

Упамінанні пра няскончаны слоўнік І. Грыгаровіча неаднаразова сустракаліся ў літаратуры, але тэкст слоўніка даследчыкамі не вывучаўся, хоць некаторыя вучоныя і сцвярджалі, што слоўнік І. Грыгаровіча на літары А. Б. В быў апублікаваны. Чым жа растлумачыць той факт, што слоўнік, апублікаваны ў сярэдзіне XIX стагоддзя, дагэтуль не вывучаны даследчыкамі?

Асноўнай крыніцай ведаў пра дзейнасць аўтара беларускага слоўніка, на якую спасылаюцца ўсе пазнейшыя даследчыкі, з'яўлялася біяграфія І. Грыгаровіча, апублікаваная яго сынам Мікалаем Іванавічам у часопісе «Странник» (1861, № 6, т. II). Каменціруючы перапіску бацькі з графам М. Румянцавым, М. Грыгаровіч дае пералік асноўных работ І. Грыгаровіча. Ён гаворыць наступнае: «Лічу не лішнім далучыць да гэтых прац яшчэ адну працу, якой заняцца прапанавала яму II аддзяленне Акадэміі навук, Слоўнік Заходне-рускай гаворкі, якую ён, зрэшты, паспеў аддрукаваць толькі 10 аркушаў і давёў уключна да літары В. Пратаірэй Іаан Грыгаровіч глыбока і грунтоўна ведаў мову, гісторыю і старажытнасці Заходне-Рускага краю. Глыбокае знаёмства яго з тутэйшымі пісьмовымі помнікамі, норавамі і звычаямі, было зарукай таго, што праца, задуманая ён шырокім плане, утрымлівала б у сабе багатыя матэрыялы для вытлумачэння народнага, рэлігійнага і грамадзянскага жыцця Заходняй Расіі. У размовах са сваімі саслужыўцамі ён нярэдка гаварыў: «Складальнік слоўніка, як праўдзівы летапісец, абавязаны запісваць усе словы, якія ўжываў і ўжывае народ у сваім хатнім побыце, у службе, сваіх малітвах да бога і ў сваіх законах; слоўнік ёсць летапіс мовы, і ў гэты летапіс павінны быць унесены ўсе факты, якія былі і ёсць».

У біяграфіі бацькі М. Грыгаровіч пісаў таксама: «Такім чынам, спецыяльнасць пратаірэя Грыгаровіча — глыбокае знаёмства з гісторыяй Заходняга Краю — знайшла сабе самую шырокую ніву дзейнасці. Але ёй адкрылася яшчэ адна галіна працы, якая абяцала выклікаць і спалучыць усе яго веды пра гэты край, — мы разумеем выклік айцу Іаану былога міністра народнай асветы князя Шырынска-Шахматава скласці слоўнік Заходне-рускай гаворкі. Чытачам нашым можа падацца дзіўным, што мы даём такое шырокае, жывое значэнне гэтай працы. Але так разумеў яе сам аўтар. У сваёй запісцы, прадстаўленай па гэтай справе, аўтар выказвае такі погляд на гэтую справу, які і цяпер мае ўсю свежасць... **Першыя дзесяць аркушаў гэтага слоўніка, надрукаваныя ў Ведамасцях II-га аддзялення Акадэміі навук**, могуць даць некаторае паняцце пра гэтую працу; але, канечне, толькі некаторае. Гэта быў **першы вопыт, толькі што пачаты, у якім аўтар не паспеў выказаць свайго апошняга слова.** Смерць абарвала працу, разам з жыццём нашага дарчвітага і нястомна дзейнага вучонага».

У некралогу «Пратаірэй І. І. Грыгаровіч», змешчаным ў «Журнале Министерства народного просвещения» (1852 № 12), сказана: «Нарэшце, нельга не пашкадаваць аб філалагічнай працы яго, якая засталася далёка няскончанай, аб працы, пачатай ім ужо ў апошнія гады жыцця па запрашэнні II аддзялення Імператарскай Акадэміі навук: **ён паспеў надрукаваць толькі дзесяць аркушаў «Слоўніка Заходне-рускай гаворкі».**

У энцыклапедычным слоўніку Бракгауза і Ефрона амаль даслоўна паўтараецца тое самае: «З задуманага ім (І. Грыгаровічам) «Слоўніка Заходнерускай гаворкі» паявіліся толькі першыя 10 аркушаў у «Изв. II Отд. Акад. наук».

Вядомы рускі этнограф і літаратуразнаўца А. Пыпін у 4 томе «Истории русской этнографии», прысвечаным Беларусі і Сібіры, пісаў: «Нарэшце, а. Грыгаровіч займаўся складаннем беларускага слоўніка; **толькі частка яго была надрукавана да смерці».** І ў зносцы дадаў: «План гэтага слоўніка, у скарачэнні, надрукаваны быў у «Отчете» II аддзялення Акадэміі за 1848 г., а цалкам у яго біяграфіі «Нарыс жыцця пратаірэя І. І. Грыгаровіча», у «Страннике», 1861, т. 2, стар. 303-338)».

У другім месцы А. Пыпін гаворыць не так катэгарычна: «Мы ўпаміналі вышэй, што беларускі слоўнік пачаў складаць яшчэ пратаірэй Грыгаровіч, але за яго смерцю слоўнік застаўся ў самым пачатку, на 10 аркушы. Рускае аддзяленне Акадэміі, жадаючы давяршыць гэтую работу, прапанавала ўзяцца за гэта двум ўраджэнцам Заходняга Краю, Насовічу і Мікуцкаму: апошні паведаміў толькі нязначны матэрыял, а Насовічу ў 1863 г. прадставіў на Дзямідаўскую прэмію цэлы багаты слоўнік, над якім ён працаваў на працягу 16 гадоў. Рускае аддзяленне ўзяло на сябе друкаванне слоўніка». Тут А. Пыпін ужо нічога не гаворыць пра надрукаванне слоўніка І. Грыгаровіча.

Такім чынам, ва ўсіх пералічаных крыніцах было сказана, што 10 аркушаў слоўніка былі надрукаваны, а некаторыя аўтары, у тым ліку і сын І. Грыгаровіча, сцвярджаюць, што яны былі надрукаваны ў «Ведамасцях II-га Аддзялення Акадэміі навук». Гэтую версію паўтарыў і беларускі мовазнаўца М. Судзілаў у артыкуле «Збіральнік беларускай старажытнасці» (часопіс «Беларусь», 1945, №№ 11—12). «Толькі першыя 10 аркушаў, — піша М. Судзілаў, — паспеў ён (І. Грыгаровіч) надрукаваць». Але ніхто з іх не дае **дакладнай** спасылкі на выданне, у якім быў надрукаваны слоўнік, не называюць года публікацыі.

А між тым, у бібліяграфічным даведніку І. М. Каўфмана, у якім улічаны ўсе энцыклапедыі і слоўнікі, слоўнік І. Грыгаровіча не зарэгістраваны. Я. Карскі, робячы ў першым томе «Беларусаў» агляд асноўных крыніц на беларускай мове, таксама не называе сярод друкаваных прац слоўнік І. Грыгаровіча. Ён называе толькі «План беларускага слоўніка», надрукаваны ў скарочаным выглядзе ў «Отчете» II аддзялення Акадэміі навук за 1848 год, і поўны план, апублікаваны ў часопісе «Странник» за 1861 год.

У бібліяграфічнай картатэцы Аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна таксама лічацца толькі гэтыя звесткі. У паказальніку літаратуры «Матэрыялы да беларускай бібліяграфіі. Т. 4. Этнаграфія» (Мінск, Інбелкульт, 1927), складзеным А. Шлюбскім, у раздзеле «Слоўнікавы матэрыял», маецца толькі ўказанне на «матэрыялы па складанні слоўніка» І. Грыгаровіча, змешчаныя ў часопісе «Странник».

У кнізе «Беларускае мовазнаўства. Бібліяграфічны даведнік», складзенай А. Васілеўскай, М. Жыдовіч, Я. Рамановіч і А. Юрэвіч (Мінск, 1967), зарэгістраваны таксама толькі план беларускага слоўніка І. Грыгаровіча са «Странника».

Усё гэта дае падставы меркаваць, што слоўнік Івана Грыгаровіча апублікаваны не быў. Для большай яснасці звернемся яшчэ да некаторых фактаў.

У выданні «Отчет Императорской Академии наук по Отделению русского языка и словесности за 1848 г.» паведамлялася: «Па гэтым выпадку пан Старшынствуючы ў Аддзяленні прапанаваў падрабязны план, у якім размеркаваны прадметы, што патрабуюць неадкладнай апрацоўкі. Першае ў ліку іх месца займае папаўненне слоўніка, выдадзенага Аддзяленнем; другое — стварэнне граматыкі рускай мовы; трэцяе—разгляд матэрыялаў па выданні Слоўніка абласных слоў; чацвёртае — **складанне беларускага слоўніка і пятае — маларасійскага».**

«Падрыхтоўку і рэдакцыю Беларускага слоўніка неабходна, між іншым, згодна з заўвагай пана Старшынствуючага, і для поўнага разумення выдаваемых на гэтай гаворцы Археаграфічнай камісіяй важных і цікавых гістарычных актаў, Аддзяленне ўсклала на пратаірэя ўласнага яго імп. вялікасці двара Іаана Грыгаровіча. Ён прадставіў падрабязнае апісанне працы сваёй».

Другое паведамленне пра слоўнік І. Грыгаровіча надрукавана ў «Известиях имп. Академии наук по Отд. рус. языка и словесности» (т. 1, 1852). На старонцы 74 «Известий...» чытаем: «З гэтага можна выключыць толькі слоўнік, які друкуецца цяпер пратаірэем І. Грыгаровічам пад апекай Аддзялення...» Значыць, у 1848—52 гадах І. Грыгаровіч (памёр ён 2 лістапада 1852 года) працаваў над слоўнікам і дзесяць аркушаў слоўніка **былі надрукаваны пры яго жыцці.** А гэта азначае, што ў выданні «Известия...» гэтыя 10 аркушаў маглі быць надрукаваны толькі ў 1852 годзе (з гэтага года пачалі выдавацца «Известия...»), бо яны былі надрукаваны пры жыцці аўтара. Аднак у першым томе «Известий...» слоўніка І. Грыгаровіча няма. У ім паведамляецца толькі аб тым, што І. Грыгаровіч «друкуе» свой слоўнік «пад апекай Аддзялення». У наступным, 2-м томе, выдадзеным у 1853 годзе, змешчаны ўжо слоўнік С. Мікуцкага «Абласныя словы беларускіх старцаў», а гэты слоўнік Аддзяленне рускай мовы і славеснасці разглядала як працяг слоўніка І. Грыгаровіча.

Усё гэта наводзіць на думку, што І. Грыгаровіч **паспеў апублікаваць толькі свае заўвагі па пытаннях складання, а таксама план слоўніка. Сам тэкст слоўніка, падрыхтаваны ім на літары А. Б, В. быў, відаць, набраны і існаваў толькі ў карэктурных аркушах, але не быў выдадзены або апублікаваны ў перыядычным выданні.**

Чаму слоўнік не апублікаваны ў «Известиях...» пасля смерці І. Грыгаровіча — цяжка сказаць. Можа іменна таму, што слоўнік рыхтаваўся да асобнага выдання, маглі затрымацца адбіткі-гранкі і ў цэнзуры. Але на пытанне, ці існуе публікацыя тэкста слоўніка І. Грыгаровіча, трэба адказаць адмоўна. Гэтай публікацыі, відаць, **не было.** Сведчанні ж першых даследчыкаў навуковай спадчыны І. Грыгаровіча пра тое, што пачатак слоўніка быў апублікаваны, могуць быць аднесены і да заўваг І. Грыгаровіча, і да плана слоўніка (усё гэта можна разглядаць як прадмову да слоўніка), і да карэктурных адбіткаў самога слоўніка. А можа проста яны не заўважылі таго, што сын аўтара «Слоўніка Заходне-рускай гаворкі» памыліўся, калі напісаў, што слоўнік бацькі быў надрукаваны ў «Известиях...».

У сувязі з тым, што слоўнік не друкаваўся, яшчэ большую каштоўнасць мае для нас знаходка рукапісу беларускага слоўніка І. Грыгаровіча. Зараз архіў Івана Іванавіча Грыгаровіча, у тым ліку і рукапіс яго слоўніка, знаходзіцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва БССР у Мінску. Ён чакае сваіх даследчыкаў.

Н. ВАТАЦЫ.

Кніжныя навінкі

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь», «Калінавыя зоры» П. Прыходзькі (мастак Г. Скрыпнічэнка), «Рэкі цякуць з ручаёў» Я. Рамановіча (мастак Ул. Чарнышоў), «Белае неба» І. Ласкова (мастак Л. Дубавіцкая).

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Эдзі Агняцвет. Падарожнік. (Вершы для дзяцей). Мастак М. Бельскі. 1969 г. Тыраж 21 500 экз. 48 стар. Цана 27 кап.

Т. Арлова. Ты і я. (Аб людзях і праблемах сучаснага савецкага тэатра і кіно). Мастак В. Тарасаў. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 2 000 экз. 240 стар. Цана 66 кап.

Васіль Зуёнак. Крутаяр. Вершы. Мастак Г. Скрыпнічэнка. 1969 г. Тыраж 3 000 экз. 72 стар. Цана 21 кап.

Іван Ласкоў. Белае неба. Вершы. Мастак Л. Дубавіцкая. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 2 700 экз. 72 стар. Цана 23 кап.

Пятрос Прыходзька. Калінавыя зоры. Вершы і паэма. Мастак Г. Скрыпнічэнка. 1969 г. Тыраж 3 000 экз. 96 стар. Цана 36 кап.

Яўген Рамановіч. Рэкі цякуць з ручаёў (аб нараджэнні і станаўленні беларускага прафесійнага тэатра). Мастак Ул. Чарнышоў. 1969 г. Тыраж 4 700 экз. 176 стар. Цана 20 кап.

Давід Сімановіч. Мінуты. Вершы. Мастак І. Капылян. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 5 700 экз. 64 стар. Цана 17 кап.

Уладзімір Скарынкін. Буслы над аграгромам. Першая кніга паэта. Мастак В. Жыжэнка. 1969 г. Тыраж 2 000 экз. 80 стар. Цана 19 кап.

Марк Смагаровіч. Пачастунак. Вершы. Мастак Ю. Зайцаў. 1969 г. Тыраж 2 000 экз. 56 стар. Цана 14 кап.

Аванес Туманян. Лірыка. Пераклад з армянскай мовы. Мастакі Ул. і М. Васалыгі. 1969 г. Тыраж 1 500 экз. 120 стар. Цана 48 кап.

Яны афармляюць нашы кнігі

МАСТАК—РЭДАКТАР

Вось ужо дваццаць гадоў мінула, як Вірынея Жыжэнка скончыла вучобу ў Маскоўскім паліграфічным інстытуце. Яна займалася там на аддзяленні мастацкага афармлення кнігі. Сярод яе настаўнікаў быў славуты майстар кнігі Андрэй Ганчароў.

Малады мастацкі рэдактар стала працаваць у Дзяржаўным выдавецтве БССР (цяпер «Беларусь»). Набытыя ў гады вучобы веды ўзбагачаліся. Ёй пашчасціла працаваць пад кіраўніцтвам такога вопытнага мастака, як Мікалай Гуцієў.

Колькі за гэты час кніг прайшло праз яе рукі! Колькі мастакоў пачулі ад яе сяброўскую параду, адчулі яе карысную дапамогу! Можна смела сказаць, што Вірынеяй Жыжэнка нямала зроблена для таго, каб беларуская кніга атрымала шырокае прызнанне ў нашай краіне.

І не толькі як мастацкі рэдактар працуе яна. Нямала кніжак выдавецтва «Беларусь» афармлены асабіста ёю. Назавем тут, напрыклад, два выданні «Першага снегу» Б. Бур'яна, кнігі М. Кусянкова «Жывіца», К. Цвіркі «Чарназём», А. Пысіна «Мае мерыдыяны», Х. Мальцінскага «Роўны дом», А. Астапенкі «Дзень маёй радзімы» М. Сурначова «Барвовая зара», Н. Кісліка «Размова з сябрамі».

Цяпер выходзіць у свет паэтычная серыя «Першая кніга паэта». Аўтар афармлення гэтай серыі—Вірынея Жыжэнка.

Няпроста спалучаць работу па мастацкаму рэдагаванню афармлення кніг і ўласную творчасць. Але на рабочым стале Вірынеі Жыжэнка — заўсёды і ўласныя эскізы. Так, цяпер у вытворчасці знаходзіцца афармленая ёю кніжка загадак, рэбусаў, красвордаў «Падумай, адгадай», а неўзабаве яна завершыць афармленне «Вершаў» Ул. Жылкі.

Ул. БРЫГ.

З АРХІЎНЫХ ПАЛІЦ

ПАЭТ-СЕЛЯНІН ВІЛЬГЕЛЬМ ПРАТАСЕВІЧ

Урыўкі з верша, які прапануецца ўвазе чытачоў, належаць невядомаму дасюль беларускаму паэту XIX стагоддзя Вільгельму Пратасевічу. Яго вершы не пабачылі старонак газет ці часопісаў. Гэта хутчэй за ўсё быў селянін, які нейкім чынам набыў невялікую асвету. Ён з тых вершатворцаў-самаўкаў, якія належалі да стваральнікаў ананімнай беларускай літаратуры, «гутаркі» і «гавэнды» якіх разыходзіліся вусна або ў спісах сярод сялян і дробнай шляхты, завучваліся напамяць, бо былі начісаны складна, расказвалі пра нейкія мясцовыя, часам вельмі лакальныя падзеі, а таму выклікалі цікавасць у мясцовага насельніцтва.

Біяграфічныя звесткі пра В. Пратасевіча вельмі скупыя. Нават год нараджэння яго невядомы. З архіва вядомага беларускага фалькларыста і этнографа Міхала Федароўскага, дзе захоўваюцца творы В. Пратасевіча (рукапісны аддзел бібліятэкі Варшаўскага універсітэта), вядома, што паэт паходзіў з вёскі Барышын на Навагрудчыне і што ён памёр у 1880 годзе. Праз дваццаць гадоў пасля смерці В. Пратасевіча невядомы карэспандэнт даслаў М. Федароўскаму творы паэта-селяніна.

Гутарка «Суседчык Гавейскі» (а менавіта так вызначаны жанр твора ў рукапісу) мае 266 радкоў. Напісана яна В. Пратасевічам, як сведчыць прыпіска, «каля 1875 года». Чытач мае магчымасць пераканацца, што напісана яна жыва і займальна, з іранічнай і саркастычнай усмешкай па адрасе паноў, даволі сакавітай народнай мовай, хоць і з дыялектнымі формамі і пэўным дамешкам паланізмаў. У ёй даволі ярка перадаюцца падзеі, пра якія расказвае аўтар. Як сведчаць апошнія радкі «Суседчыка Гавейскага», аўтар не пазбягае і сацыяльных матываў.

У беларускай літаратуры такія «паляўнічыя апавяданні», напісаныя вершам, здаецца, не сустракаліся. Такім чынам, твор В. Пратасевіча каштоўны для нас як узор творчасці, паэзіі на беларускай мове другой паловы XIX стагоддзя.

Разам з гэтай гутаркай у архіве М. Федароўскага захоўваецца маральна-дыдактычны верш В. Пратасевіча «Хоць нам вяляць кожнідзы водачкі не піць», у якім аўтар, ідэалізуючы ў некаторай ступені «добрага пана», выступае супраць п'янства і домастроеўскіх парадкаў у сямейным побыце. Вось яго словы:

Ато толькі кепска, хто ў карчму ходзіць,
Нап'ецца, што на нагах стаяць,
А прышоўшы, дома і б'ецца і лае,
Дзярэ косы жонкі, дзеткі разганяе.
А после назаўтра з сваё беднай хаткі
Валачэ ў карчму худобы астаткі...

Творы невядомага дасюль паэта Вільгельма Пратасевіча папаўняюць наша ўяўленне пра развіццё беларускай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя, менавіта ў 70-я гады, калі пасля паўстання 1863 года мастацкая творчасць на Беларусі, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, усё ж развівалася.

Я. САЛАМЕВІЧ.

Вільгельм ПРАТАСЕВІЧ

СУСЕДЧЫК ГАВЕЙСКІ

Пара, паночкі, пара ўставаць,
З пшоннай булачкай выпіці чаёк,
Устыд вам, паночкі, аж да дня ляжаць,
Збірайцеся дружна, едзьце у лясок,
Ўшак жа сабраліся, кабы паляваць...,
Няўжо ж дзень з ноччу ўсё ў карты граць!...
. . . . . .
І вы, наяжджачы, жыва, паскарэй
Дайце аўса коням, удзеньце кульбакі
Да настаўце вады прэндзенькэ жывей,
Бо трэба пакарміць панскія сабакі.
І стрэльчыкі мілы, жыва уставайце
Да пачысьце стрэльбы далей да ахвоты,
Адны новенькія лапці надзявайце,
Кладзеце суконкі, нашмаруйце боты.
Паны то у брычках, то едуць вярхом,
А вы паспяшайце, каб барджэй пад'есць,
Вам трэба, браточкі, дрыпаці пяшком,
А да лесу будзе болей вёрстаў шэсць...
. . . . . .
Калі я тут, куме, хоць крышку салгаў,
Каб я марна згінуў, каб марна прапаў!
Божа, мне паможь, што то шчыра моа,
Што тут няма фальшу ні аднаго слова!...
. . . . . .
Вышлі мы з дубіны да ў кнею нову
Усе цераз дарогу зараз к Паланову.
Тут, як толькі гончы зайца выганілі,
Неякіясь паны зараз і забілі.
Потым як зачалі паны пудлаваць,
То к аднаму зайцу болей разоў пяць.
А ведаеш, куме, чаму так страляюць!
Бо ў адной стрэльбе па дзве руркі маюць!
А наш браток бедны к адной як прывык,
Як возьме на вока, так звярына—брык!
Мы не любім, куме, на вецер страляць,
А што толькі стрэлім, ёсць што паднімаць.
Хто не глядзіць у дзве руркі,
Хто пільнуе адной дзюркі,
Той ці ў шчасці, ці ў бядзе,
Што ні стрэліць — пападзе!...
. . . . . .
От, мой мілы куме, як дзянёк прайшоў,
А потым з нас кожны як у двор прыйшоў,
Да і на саломку у стаенку спаць,
А паны, пад'еўшы, селі ў карты граць...
. . . . . .
Выбач, мілы куме, можа я дадзеў,
Брэшучы дзень трэці аб нашай ахвоце,
Да і ты здзівіўся б, кабы паглядзеў,
Як чорт паноў носіць па лесе, балоце.
Ай, што-та нам учора не ішло ў лад,
Бо хоць то пакочкі стапі ціха ў рад,
Па сто раз трубілі сабакі пускаць,
Але наяжджачам пад ветр не чуваць.
Но после пачулі, сабакі пусцілі,
Да паглядзі, псяюхі, што яны зрабілі;
Звалілася на каня цэлая дружына,
Што ледва ў сяло ўцякла скаціна...
Да і павярнулі зноў на сенажатку,
Стрэліў пан маршалак, але міма, братка,
І пагналі к чорту недзе аж за рэку.
После нашлі «зайца» — трэба ж чалавеку —
Кажуць, з кір'яноўцаў, зайчыка спаткаць,
Як пальнуў, так каток брык на сенажаць.
А после паночкі на дарозе сталі
Да і да бутэлек парадкам стралялі...
Ласковіч ў паперак увярцеў чарапок:
«А ну, пане лысы, стрэль ты, галубок!..»
Пратасэвіч, бачыш, — а каб яго бог,—
Узяў сваю стрэльбу паміж сваіх ног
І як смальне, куме, ці дасі ты веры,
Што нашлі ў паперы шрацины чатэры...
После нібы холад стаў паночкаў браць,
То і драла ў ногі — пашлі уцякаць...
. . . . . .
Годзе брахаць, куме, трэба сошку браць,
Ісці на панскае полечка гараць.
Ты ўжо адбыў пекла, табе не бяда,
А мне гатоў у с... трэснуць Каляда.
Жычу табе, куме, каб ты здароў быў,
Мне прабач, што многа табе гаварыў.
І яшчэ б я многа мог нагаманіць,
Но баюся паноў, каб не разбудзіць.
Бо хоць яны добры, ласкавы паны.
Да мужыкам лепей, калі спяць яны.

ВОПЫТ ПАДКАЗВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Многа ўвагі мы аддаём зборачным цэхам. Рабочае месца зборшчыка — тое поле, дзе адбываюцца найтанчэйшыя маніпуляцыі зборкі механізма гадзінніка. Яно пастаянна пад пільнаю ўвагаю Бюро тэхнічнай эстэтыкі. Напружаная праца на канвееры патрабуе асаблівых умоў — вельмі важна правільна выбраць колернае рашэнне рабочага поля, каб вока зборшчыка менш стамлялася і лёгка бачыла дробныя дэталі гадзінніка. Праз кожную гадзіну зборшчыку неабходны перапынак — зняць напружанне (як зрокавае, так і мышачнае). Таму ў холах для адпачынку (яны ёсць у зборачных цэхах) уведзены элементы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (мазаічныя дэкаратыўныя пано). Адзін з холаў афармлены як куток Таварыства балгара-савецкай дружбы. У холах за пятнаццаціхвілінны перапынак зборшчыкі атрымліваюць пэўную эмацыянальную зарадку: змена ўражанняў ад манахромнай гамы канвеера і шматфарбнай колеравай насычанасці холаў здымае зрокавае напружанне і спрыяе аднаўленню працаздольнасці.

Думка заводскага калектыву—закон у ацэнцы работы нашага бюро, а шырокае абмеркаванне новаўвядзенняў у галіне тэхнічнай эстэтыкі — зарука правільнай, паспяховай работы.

ВОПЫТ нашага бюро падказвае, што толькі комплексныя вырашэнні той ці іншай праблемы здольны прынесці станоўчыя вынікі. Ніякія частковыя вырашэнні, паўмеры не здольныя карэнным чынам змяніць агульную карціну вытворчага асяроддзя.

Так, напрыклад, эстэтычна ўдала вырашаны які-небудзь элемент вытворчага абсталявання цэха (тумбачка слесара-наладчыка, шафа для захоўвання дэталяў і да т. п.) сам па сабе мала што дасць. Па-за сувяззю з агульным рашэннем усяго цэха (ад афарбоўкі і планіроўкі памяшкання і абсталявання да эскізаў рабочага адзення) асобныя дэталі будуць толькі ярчэй падкрэсліваць эстэтычную неманстаўгоднасць усяго цэха, унясуць у работу яшчэ большы разлад. Калі ж інжынер-канструктар, інжынер-тэхнолаг і мастак-канструктар аб'яднаюць свае намаганні ў самым пачатку работы над планам рэканструкцыі, распрацоўкай новага станка або прамысловага вырабу (не кажучы ўжо аб новым будаўніцтве прамысловых аб'ектаў, дзе ўдзел мастака-канструктара несумненна павінен быць з самай першай рыскі), тэхнічная эстэтыка здольная быць магутнейшым рычагом пад'ему эканомікі.

Так падказвае станоўчы вопыт нашага завода.

Але ў нашай рабоце, на жаль, ёсць не толькі станоўчае. Дзіўнае, неверагоднае становішча склалася ў аддзеле галоўнага канструктара, дзе распрацоўваюцца новыя, перспектыўныя мадэлі гадзіннікаў. Там, дзе патрэбен спецыяліст высокай кваліфікацыі ў галіне тэхнічнай эстэтыкі, няма ніводнага мастака. І работу мастака даводзіцца выконваць інжынерам-канструктарам, якія не маюць спецыяльнай падрыхтоўкі ў галіне дызайна. Такое становішча, зразумела ж, замінае выпуску прадукцыі самай высокай якасці. Незразумелая пазіцыя кіраўніцтва завода ў пытанні ўвядзення ў штатны расклад адзінкі мастака-канструктара. Хаця Бюро тэхнічнай эстэтыкі існуе вось ужо тры гады, мастакі-канструктары лічацца ў штатным раскладзе звычайнымі канструктарамі, інжынерамі, а на іншых прадпрыемствах — тэхнолагамі, малярамі, токарамі і да т. п.

Гэта ж не сакрэт, што ніводнае прадпрыемства не можа абысціся без мастака. Дык навошта ж маскаваць яго пад рознымі ярлыкамі, калі куды прасцей называць усё сваімі ўласнымі імёнамі?!

ЦЯПЕР на многіх прадпрыемствах Мінска створаны бюро, аддзелы і групы тэхнічнай эстэтыкі. Прымаючы ўдзел у рабоце савета па тэхнічнай эстэтыцы пры Савецкім раённым камітэце партыі, мне давялося блізка пазнаёміцца з работай і арганізацыяй некаторых з іх. Аналізавалася работа Бюро тэхнічнай эстэтыкі на заводах імя Вавілава, гадзіннікавым і некаторых іншых. Высветліўся шэраг станоўчых якасцей, шэраг неадкладных патрэб. Сталі больш яснымі і агульныя заканамернасці ў арганізацыі і рабоце такіх бюро.

Асабліва вострае і балючае пытанне — кадры. Высокакваліфікаваных спецыялістаў амаль няма. Часта на пасаду мастака-канструктара прадпрыемства вымушаны браць мастака (жывапісца або графіка, які не мае спецыяльнай падрыхтоўкі) або інжынера-канструктара, які трохі ўмее маляваць. Такому «спецыялісту» цяжка працаваць у галіне дызайна. А курсаў па павышэнні кваліфікацыі мастакоў-канструктараў у нас пакуль што, на вялікі жаль, няма. А іх можна было б арганізаваць, напрыклад, пры Беларускім філіяле Усесаюзнага навукова-даследчага Інстытута вытворчай эстэтыкі. Спецыялісты іншых профіляў маюць у рэзерве значны арсенал сродкаў павышэння свайго прафесіянальнага ўзроўню (розныя курсы, семінары, сімпозіумы, выстаўкі, нарэшце—падручнікі). У галіне ж тэхнічнай эстэтыкі гэтыя сродкі вельмі абмежаваныя. Таму неабходна прыняць неадкладныя меры, каб хаця кіраўнікі бюро, груп і аддзелаў тэхнічнай эстэтыкі былі больш шырока інфармаваны праз памянёны філіял усесаюзнага інстытута аб семінарах і выстаўках, аб розных навінках, каб для іх быў арганізаваны абмен творчым і арганізацыйным вопытам на семінарах, сімпозіумах і да т. п.

АДЗНАЧУ, што ў нас намеціліся пэўныя зрухі ў складанай, цяжкай справе падрыхтоўкі мастакоў-дызайнераў. У Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце ёсць спецыяльныя кафедры. На жаль, нават тут не ўсе выкладчыкі аднолькава сур'ёзна разумеюць значэнне так званага «прамысловага мастацтва». Пра гэта сведчаць пытанні і заўвагі, якія мне даводзілася чуць у інстытуце пры ацэнцы курсавых і дыпломных работ будучых мастакоў-канструктараў. У гэтых пытаннях і заўвагах яўна адчувалася неразуменне, пагарда да дыпломных праектаў па інтэр'еры і абсталяванні, мастацкім канструяванні мэблі.

Мабыць, трэба ў розныя камісіі па ацэнцы ведаў і майстэрства будучых мастакоў-канструктараў не ўводзіць асоб, якія не маюць да галіны дызайна ніякага дачынення. Больш таго, магчыма мэтазгодна было б факультэт вытворчай эстэтыкі мець і пры політэхнічным інстытуце, паколькі там існуе кафедра архітэктуры.

Вельмі важна хутчэй вырашыць і пытанні, звязаныя са становішчам мастака ў вытворчасці. Я цалкам падтрымліваю выказаныя ў друку прапановы аб тым, каб на заводах мелася пасада галоўнага мастака завода на ўзроўні галоўнага інжынера і галоўнага канструктара. Работа мастака-канструктара—няспынны творчы працэс. Дызайнер павінен мець час на пастаяннае ўдасканальванне майстэрства. Яму трэба пісаць з натуры, займацца малюнкам, развіваць культуру колеру, сістэматычна наведваць музеі, мастацкія і тэхнічныя выстаўкі, вывучаць спецыяльную літаратуру, быць у курсе ўсіх дасягненняў у тэхнічнай эстэтыцы. Зусім зразумела, што мастаку-канструктару, які працуе на заводзе, неабходны на тыдні дадатковы творчы дзень, які б аплочваўся. Мне здаецца, ва ўмовах работы нашых прадпрыемстваў ёсць усе магчымасці ўвесці такі дзень у сістэму.

І яшчэ адно важнае пытанне. Неабходна знаёміць са значэннем тэхнічнай эстэтыкі і з яе асновамі адміністрацыю прадпрыемстваў, іх кіраўнікоў. Магчыма, былі б мэтазгоднымі спецыяльныя семінары на ўзроўні дырэктараў прадпрыемстваў і іх намеснікаў, паколькі ў асноўным менавіта іх слова—рашаючае ў ацэнцы той ці іншай работы мастака-канструктара. Безумоўна, такія семінары памаглі б кіраўнікам прадпрыемстваў больш кампетэнтна, больш абгрунтавана фармуляваць ацэнкі пошукаў дызайнераў, не абмяжоўваючыся «ацэнкамі» тыпу. «не пойдзе, не падабаецца», або «не падабаецца, не пойдзе».

Ад таго, што становішча мастакоў-канструктараў на вытворчасці нестабільнае, дрэнна задавальняюцца самыя розныя іх патрэбы. Так, напрыклад, яны кепска забяспечваюцца фарбамі, пэндзлямі, аэрографамі. А гэта ж тое самае, што нястача цыркуля і лінейкі для канструктара. Патрэбна цэнтралізацыя забеспячэння Бюро тэхнічнай эстэтыкі неабходнымі матэрыяламі. Бо інакш даходзіць да смешнага — знаходзяцца «спецыялісты», якія саматужна выробляюць аэрографы і прадаюць іх у прыватным парадку па высокіх цэнах. Няўжо нельга наладзіць вытворчасць гэтых вельмі неабходных мастаку-канструктару прылад працы, зрабіць для яго даступным набыццё высокаякасных мастацкіх фарбаў і пэндзляў? Магчыма, мэтазгодна стварыць секцыю дызайнераў пры Саюзе мастакоў, каб яны і былі арганізаваны творча, і маглі б набываць розныя матэрыялы для творчасці праз сістэму Мастацкага фонду?

У МІНСКУ паспяхова працуе досыць вялікі калектыў мастакоў-канструктараў. Пра іх плённую работу сведчыць Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі БССР. Многія экспанаты выстаўкі адпавядаюць высокім патрабаванням тэхнічнай эстэтыкі. Работы бюро трактарнага і аўтамабільнага заводаў, завода лічыльных машын пакідаюць цудоўнае ўражанне ад удалага сплаву канструктарскай і эстэтычнай думкі.

І ўсё ж да сапраўды масавага пранікнення тэхнічнай эстэтыкі на вытворчасць пакуль што яшчэ далёка. На шляху мастакоў-канструктараў яшчэ нямала цяжкасцей. І яны гэта разумеюць. Памагчы пераадолець гэтыя цяжкасці здольны вопыт, які накопліваецца з кожным годам, выхаванне кадраў, якое ў нас паступова наладжваецца, пастаянны кантроль і дапамога мастакам-канструктарам з боку філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута вытворчай эстэтыкі і іншых зацікаўленых арганізацый.

Сезон 1969-70 гг.

ПАПЛЕЧНІКІ КАМПАЗІТАРАЎ

Шчыра кажучы, кожны артыст-выканаўца з'яўляецца творчым паплечнікам кампазітара-сучасніка. Аднак бываюць такія артысты і калектывы, якія прысвячаюць сваю дзейнасць на канцэртнай эстрадзе прапагандзе пераважна навінак музычнай літаратуры, адкрываюць мала вядомыя творы, даюць пуцёўку ў жыццё партытурам, што па розных прычынах заставаліся дагэтуль па-за ўвагай віртуозаў.

Такі квартэт Саюза кампазітараў БССР, створаны ў 1961 годзе. Калектыў малады па стажы, ён набірае якасці сапраўды творчага ансамблю, здольнага ўнесці свой прыкметны ўклад у музычнае жыццё рэспублікі. У складзе квартэта адбыліся пэўныя змены, але галоўнае крэда, з якім ён пачынаў свой шлях, застаецца для яго непарушным—знаёміць грамадскасць з творамі беларускай камернай музыкі. Зроблена артыстамі многае — квартэт даў адкрытыя канцэрты ў сталіцы рэспублікі і гастралірує па гарадах, выступае на клубных эстрадах і на пагранічных заставах, яго ведаюць радыёслухачы. Творы Залатарова, Яфімава, Аладава, Падкавырава, Лускаса і іншых кампазітараў складаюць рэпертуар ансамбля, рэпертуар, які ўзбагачаецца і пашыраецца.

Дзейнасць ансамбля карысная і для кампазітараў — яны маюць магчымасць апрабіраваць плён сваіх творчых пошукаў у «жывым выкананні». Мабыць, невыпадкова ў апошні час у беларускай музычнай літаратуры з'яўляецца ўсё больш квартэтнай музыкі. Ансамбль набывае значэнне творчай лабараторыі: можна прывесці прыклады, калі аўтар прыносіць артыстам асобныя часткі новага твора, каб нешта праверыць і ўдакладніць пасля праслухоўвання, перабудаваць фрагменты і знайсці развіццё сваёй задумы. Артысты ў такіх выпадках выступаюць сапраўднымі паплечнікамі кампазітара — даюць парады і першыя, самыя непасрэдныя і высока прафесіянальныя ацэнкі, і гаворка ідзе пра агульны пафас твора і асобныя нюансы, пра магчымасці інструмента і ўсяго ансамбля раскрыць ідэю аўтара. Супрацоўніцтва плённае і ўзаемна карыснае.

Рэпертуарны партфель ансамбля папаўняецца цікавымі творамі — у апошні час артысты выконвалі два Квартэты. Драматычныя варыяцыі і Квінтэт № 2 Аладава, квартэты Камінскага, Лучанка, Цесакова і Янчанкі, мініяцюры іншых аўтараў.

Я даўно ведаю калектыў, і ўсё роўна чарговая сустрэча з ім пакінула ў мяне яркае ўражанне. Сапраўды, квартэту цяпер «пад сілу» не толькі тэхнічныя цяжкасці, а і глыбокае і ўдумлівае пранікненне ў вобразны свет музыкі кампазітараў розных мастацкіх светаадчуванняў. Яны не толькі імкнуцца «быць» квартэтам, а паказваюць здольнасць іграць з аркестравай паўнатой гучання. Усё гэта заслуга дыпламанта рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў, першага скрыпача квартэта Ю. Гершовіча, які валодае віртуознай тэхнікай, яго дастойных партнёраў — другога скрыпача П. Валадарскага, альтыстки В. Баткінай і віяланчэліста М. Шчарбакова (ён з'яўляецца мастацкім кіраўніком ансамбля).

На канцэрце, аб якім мы расказваем, выканаўцы праявілі сябе ў першым ужо нумары праграмы — Першым квартэце на беларускія тэмы Аладава. Дарэчы, гэты твор прагучаў на канцэртнай эстрадзе ўпершыню, хаця быў напісаны трыццаць гадоў назад. У часе вайны ноты яго былі згублены і толькі нядаўна іх выпадкова знайшлі ў адной з маскоўскіх бібліятэк. Аўтар на падставе гэтай рэдакцыі стварыў новую, якая і выконвалася ў канцэрце. Гэта цікавы твор аднаго са старэйшых майстроў беларускага мастацтва, рознабаковага і самабытнага кампазітара. Квартэт напісаны ў двух частках, глыбока нацыянальны па мове, арыгінальны па задуме. І выконваўся ён надзвычай цёпла, у ім ансамбль падкрэсліў лірызм і светлы сум першай часткі і пераканаўча перадаў жыццесцвярджальную весялосць другой...

Музычная грамадскасць Мінска нядаўна вітала госця з Чувашыі — кампазітара Івана Хадзяшава. Ён пакінуў квартэту Саюза кампазітараў БССР ноты свайго вельмі непасрэднага па пачуццях і яркага па мове камернага твора. У выкананні ансамбля Квартэт Хадзяшава прагучаў у гэтым канцэрце вельмі сакавіта і слухаўся з цікавасцю. Ён пашырае наша ўяўленне аб духоўным свеце сучасніка, аб якім расказвае кампазітар братняга народа, знаходзячы маляўнічыя сродкі ў багацці чувашскага музычнага фальклору. Праўда, тэматычны матэрыял распрацаваны аўтарам не заўсёды дастаткова шырока, і таму ў творы адчуваецца пэўная фрагментарнасць.

З добрым артыстычным уздымам выконваўся Квартэт № 72 Гайдна. Слухачы «пазнавалі» добра вядомае меламанам творчае аблічча славутага класіка. Але, на жаль, часам гублялася гайднаўская кантрастнасць асобных эпізодаў.

Для многіх слухачоў упершыню прагучаў у канцэрце Першы квартэт амерыканскага кампазітара С. Барбера. Ансамбль энергічна і напорыста «адкрыў» першыя такты гэтай яркай музыкі і потым замацаваў настрой у кульмінацыйных узлётах першай часткі твора. Стрымана і адухоўлена гучала другая частка. Уласцівы выканаўцам тэмперамент раскрыўся асабліва ярка ў фінале Квартэта С. Барбера.

Агульнае ўражанне добрае. Але нельга не адзначыць, што музыканты, якія, мабыць, і самі ведаюць свае недахопы, на гэты раз дазвалялі сабе часам інтанацыйныя недакладнасці, стракатасць штрыхавых накідаў і рытмічныя «выпады» з ансамблю. Праўда, гэта можна вытлумачыць складанасцю праграмы і адсутнасцю сталай канцэртнай практыкі (квартэт рэдка прабіваецца чамусьці на вялікую эстраду). Варта падумаць аб тым, каб гэты цікавы калектыў часцей сустракаўся са слухачамі, набываючы каштоўны вопыт і замацоўваючы свае лепшыя якасці. Трэба спадзявацца, што Саюз кампазітараў БССР і Дзяржаўная філармонія зробяць усё, каб таленавіты ансамбль меў магчымасць шырэй гастраліраваць па рэспубліцы і ў Мінску быў бы «прапісаны» як сталы канцэртны калектыў. Гэта будзе спрыяць станаўленню і жанру камернай музыкі.

Р. ГЛАЙ.

БАГАТЫ СВЕТ ДУМАК І ПАЧУЦЦЯЎ

Праграма сімфанічнага канцэрта, што адбыўся ў нядзелю, зацікавіла і тых, каго ў музыцы вабіць глыбокі роздум і рамантычная ўзнёсласць вобразаў, класічная архітэктоніка твораў, і тых, хто чакае ад праслуханага добрага зарду бадзёрасці, весялосці, дабрадушнай іроніі. Менавіта такім і з'яўляецца вобразны свет Сімфоніі до-мінор С. Танеева, Канцэрта ля-мажор для фартэпіяна з аркестрам Ф. Ліста і аркестровай сюіты паводле оперы «Кавалер руж» Р. Штрауса. З гэтымі творамі нас пазнаёмілі таленавіты мастак І. Гусман з горада Горкага і вельмі цікавая піяністка М. Мдзівані: першы дырыжыраваў Дзяржаўным сімфанічным аркестрам Беларускай ССР, другая саліравала ў канцэрце.

Найбольш складаным творам у праграме, безумоўна, з'яўляецца танееўская сімфонія. Напісаная кампазітарам, якога па праву называлі музычным мысліцелем, Сімфонія до-мінор са здзіўляючай сілай раскрывае светаўспрыйманне аўтара, яго роздум пра сэнс чалавечага жыцця і пераможную веру ў здзяйсненне светлых ідэалаў. У музыцы пануе крыштальна-строгая думка творцы, хвалюючы драматызм перажыванняў і непаўторнае хараство вобразнай мовы, дзе ёсць моманты глыбокага смутку і незадаволенасці, надзеі і радасці існавання. Гэта перададзена з вобразна лагічнай пабудовай усіх частак і асобных дэталяў. Нездарма М. Рымскі-Корсакаў пасля знаёмства з гэтай музыкай пісаў С. Танееву: «Лічу вашу сімфонію прыгажэйшым сучасным творам — высакародны стыль, выдатная форма і цудоўная распрацоўка ўсіх музычных думак».

Тое выключнае майстэрства, з якім напісана Сімфонія до-мінор, робіць яе выкананне надзвычай складаным. Ёсць небяспека рацыянальнага ўвасаблення тонка распрацаваных дэталяў твора, а гэта можа загубіць яго маштабнасць, натхнёнасць. Заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР І. Гусман памайстэрску будуе з асобных элементаў музычнай тканіны грандыёзны гмах сімфоніі — раскрывае не толькі цудоўныя грані яе формы, але, перш за ўсё, багаты свет думак і пачуццяў. Так, сімфонія ў такой трактоўцы ўзрушае слухача.

Адзначаючы цудоўнае агульнае, ўражанне ад выканання сімфоніі Танеева, адзначым, што пажадана было б, каб больш летуценна гучала ў аркестры другая тэма (пабочная партыя першай часткі твора), а пачатак Адажыо выконваўся б больш стрымана. Гэта, як нам уяўляецца, лепей падкрэсліла б характар аўтарскага роздуму і намераў.

Канцэрт ля-мажор для фартэпіяна з аркестрам Ф. Ліста — твор лірыка-драматычны. У ім, як і ў танееўскай сімфоніі, таксама раскрываецца складаны свет жыццёвых сутыкненняў, чалавечых надзей, барацьбы і перамог. Пабудаваны на супрацьпастаўленні вялікіх магчымасцей саліруючага фартэпіяна і багацця аркестравых выказванняў, Канцэрт у пэўнай ступені з'яўляецца творчым спаборніцтвам індывідуальнасцей піяніста і дырыжора. І спаборніцтва лаўрэата міжнародных конкурсаў імя Чайкоўскага і Маргарыты Лонг і Жака Цібо піяністкі Марыны Мдзівані з дырыжорам, хоць і не дало індывідуальнага пераможцы — бо перамагла музыка! — аказалася вельмі хвалюючым і змястоўным. Пра высокую тэхнічную ўзброенасць артысткі няма чаго гаварыць, бо для выканаўцы такога маштабу — гэта норма. Але нельга не адзначыць вялікае майстэрства М. Мдзівані як інтэрпрэтатара буйнай лістаўскай формы. Яе ігра — валявая і рашучая, разам з тым не пазбаўлена неабходнай імправізацыйнасці, якая нараджаецца непасрэдна тут, у час выканання музыкі, і з'яўляецца натхнёным вынікам глыбока прадуманай творчай канцэпцыі, вынікам уласнага «бачання» і адчування думак кампазітара. У моцнай лепцы лістаўскіх вобразаў салістка і дырыжор жылі адным подыхам.

Піяністка М. Мдзівані.

За пультам — І. Гусман.

Закончыўся сімфанічны канцэрт пад кіраўніцтвам І. Гусмана выкананнем сюіты Р. Штрауса, куды ўваходзіць пяць фрагментаў з музыкі кампазітара да яго камічнай оперы «Кавалер руж». Фрагменты гэтыя раскрываюць лірыка-камедыйныя падзеі, якімі захоплены героі твора: стары барон Лерхенау, які хоча ажаніцца з маладой Сафі, сама дзяўчына, кузіна барона — княгіня Вердэнберг і яе юны каханы Актавіян — «кавалер руж». Маляўніча ўвасоблены ў сюіце танцавальныя сцэны. Музыка распрацавана з вялікім аркестравым майстэрствам і тэмпераментам, і ў асобе І. Гусмана, які валодае рознабаковай дырыжорскай тэхнікай і яркім мастацкім адчуваннем аўтарскага стылю, яна знайшла ўдумлівага інтэрпрэтатара.

Недаравальна было б не адзначыць вялікую работу, што прарабіў Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, хоць і не ўсё ў яго атрымалася як мае быць. Шмат прыемнага вынеслі слухачы ад сольных эпізодаў, што прагучалі ў праграме ў выкананні заслужаных артыстаў БССР С. Асановіча і Б. Скабло, габаіста В. Фралова і асабліва ігры стажора аркестра, валтарніста Ч. Юшкевіча. На жаль, не задавальняе тое, што вельмі малая колькасць артыстаў струннай групы, асабліва першых скрыпак, перашкаджае патрэбнай у калектыве роўнавазе гучання струнных і медзі. Гэта асабліва адчувалася ў фінале сімфоніі (пераход да мажорнай коды).

І. НІСНЕВІЧ.

ПАСЛЯ ТЭАТРА

ПАСЛЯ тэатра пан дырэктар Нумерман з жонкай — паняй Альфхільдай любілі павячэраць у тэатральным кафэ. Гэта была самая мілая частка вечара. Яны часта наведвалі храм Талі, мала калі прапускаючы прэм'еры. Пані Альфхільда Нумерман лічыла гэта сваім пачэсным абавязкам, бо, зрэшты, каму ж, як не ім, грамадзянам дастаткова забяспечаным, высокаінтэлектуальным, падтрымліваць духоўнае жыццё горада.

Але ўсё-такі самае незабыўнае ў любым тэатральным вечары — сілкаванне за столікам, асабліва для пана Нумермана. Пані любіла пагаварыць аб тэатры, аб праблемах, прайсціся ў антрактах па фае, перакінуцца словамдругім, даючы ацэнку п'есе, ігры акцёраў. Яна мела сваю цвёрдую думку, свой пункт гледжання: зрэшты, мець свой погляд — не так яно ўжо і цяжка, як мяркуюць некаторыя недасведчаныя людзі, якія толькі глядзяць, але не ацэньваюць, якія — варта толькі адкрыць заслону і паказаць тронную залу ў стылі ампір — пачынаюць замілавана румзаць або скрыгатаць зубамі. Многа яшчэ такіх некрытычных людзей на белым свеце. Сядзяць сабе ў крэслах, сапуць, крэкчуць, чмыхаюць у патыліцы пярэдніх — ім што ні пакажы, усё добра, усё пераваравае.

Што да пані Нумерман, то яна зусім іншага складу. Яна не плача, не смяецца — яна глядзіць і ацэньвае. Найбольш любіць рэчы трагічныя, бо там, як вядома, ёсць што паглядзець і ёсць што ацаніць, вартасць смутных сцэн паддаецца найбольш поўнаму акрэсленню. І апрача таго — больш поўнай будзе прыемнасць пасля прадстаўлення. Бо са шматгадовага вопыту пані Нумерман добра ведала, што трагедыі найлепш спрыяюць апетыту, і, значыць, калі абед быў лёгкі, а трагедыя...

Нумерман з палёгкай уздыхнуў, набожна запіваючы курынае сцягенца слабым бардоскім віном, якое кельнер прынёс без заказу. Пан дырэктар меў сталыя звычкі, віно піў толькі пэўных марак. Але чаго яму бракавала, дык гэта паэтычнасці. З-за той яго непаэтычнасці і намелася пані Нумерман клопату, з самага першага дня, як яны пабраліся... Ён мог умяшацца ў гаворку і ляпнуць пра кніжку нейкага Джэка Лондана, якую вельмі любіў, ну, і вядома, колісь прачытаў. Назву яе пан дырэктар помніў не вельмі добра, затое змест засеў у памяці. Пан Нумерман, на жаль, меў звычку ўтыкацца з гэтай кніжкай заўсёды, калі гаворка заходзіла пра самыя актуальныя падзеі апошняга часу. У яго любімай кніжцы пісалася пра сабаку, пра незвычайнага сабаку.

Нялёгка было некалькі гадоў запар угаворваць пана дырэктара пайсці ў тэатр, прынамсі, да таго часу, пакуль ён не ўразумеў, што папершае, гэта непазбежна, па-другое — другое было яго персанальным адкрыццём—што тры даўжэзныя акты можна адседзець, смакуючы ў думках скорую вячэру. З кожным апусканнем заслоны вячэра набліжалася ледзь не на цэлую гадзіну. А калі часам ён і забываўся і нечакана для сябе пачынаў пільна сачыць за тым, як распіналіся там, на сцэне, гадзіны праляталі яшчэ хутчэй. Здаралася, што блаславёная хвіліна надыходзіла і раней, чым ён паспяваў заўважыць гэта. Тады дырэктар Нумерман весела варкаваў: «Добрая п'еса». «Цудоўная ігра» — гаварыў у гардэробе, даючы жанчыне на чай. З хвіліны, калі апошні раз закрывалася заслона, яго агартала бясконцая зычлівасць да людзей.

Але не заўсёды выходзіла гладка. Бывалі п'есы, калі акцёры, маючы нешта сказаць, то ламалі рукі ад роспачы, то ўзносіліся чортведама куды. Бегалі, насіліся па сцэне, адварочваліся ад субяседнікаў, хаця нічога страшнага не было б, калі б сказалі тое самае проста палюдску, толькі з адпаведным акцэнтам. Пан Нумерман толькі юрзаў у крэсле. Ён не пераносіў, калі людзі занадта блізка да сэрца прымалі трагічнае. Яго любімымі выслоўямі былі «face the facio» і «кончым з гэтым». Калі жыццё пераступала рамкі гэтых прынцыпаў, Нумерман бурчаў уголас, і тады жонка ў паўцёмнай зале зноў мела з ім клопат, ці, кажучы інакш, проста шчыпала яго за руку. Лепш бывала, вядома, калі ўдавалася прыдрамнуць хвіліну, бо на шчасце ў яго была цудоўная сістэма. Галава яго крыху скілялася і бестурботна спачывала на двайным падбароддзі, якое сведчыла аб вялікай волі. Выдыхаючы, ён толькі выдаваў кароткае і непрыкметнае пт-пт, якое чула адна толькі пані Нумерман.

Самае горшае для пана Нумермана — Шэкспір. Нумерман наогул трываць не мог, калі гаварылі вершамі, лічыў гэта ненатуральным. Нічога яшчэ, калі там якая песенька або дасціпны тост, але калі пачыналі пра самае звыклае тарочыць узнёслымі вершамі — тут ужо дайце рады, усякаму цярпенню прыходзіў канец. Нельга ж спакойна слухаць усякае глупства. Асабліва калі яшчэ за свае грошы... А што да жончынага клопату, то, калі ўжо яна цягне на такія відовішчы, то хай ёй тых клопатаў будзе па завязкі. Набыты вопыт падказваў Нумерману, што прадстаўленне заўсёды цягнецца даўжэй, калі акцёры гавораць вершам. Яны нібы дражнілі яго сабе на ўцеху. Ён часта дзіву даваўся — як гэта такая высокаінтэлектуальная асоба, як пані Нумерман, не заўважае, што іх проста дураць, водзяць за нос.

Аднак пані Нумерман патрапляла растлумачыць, і ўсе гэта чулі, што яму нестае пачуцця паэзіі. Так яно і было, вядома. Але ў яе словах быў і прыхаваны сэнс, яму, прынамсі, зразумелы, бо тон, якім яна гаварыла, здаецца, азначаў: не бойцеся, Нумерман і без паэзіі хоць куды! Адзін бог ведае, ці ў глыбіні душы яна з радасцю не ахвяравала б яго пачуццём паэзіі на карысць адной ёй вядомых вартасцей.

Нумерман чокнуўся з жонкай: «Цудоўны вечар!» Гэта магло быць сказана пра спектакль, які на шчасце рана закончыўся, або і пра ўвесь вечар. Пані Альфхільда кіўнула, яе прамяністы позірк свяціўся захапленнем.

— Ніколі не забуду Вінкеля ў апошнім акце,—сказала яна.

Пан Нумерман згодна падтакнуў і з асалодай пацягнуў віно. У яго было тонкае пачуццё, ён умеў цаніць сапраўды каштоўнае. Апрача таго ён адкрыў—і гэтым нельга пагарджаць,— што смачная, сытная ежа, запітая марачным віном,— крыніца выдатнага настрою, зусім не падобнага на той, які бывае падчас вясёлых выпівак з сябрамі на пышных абедах, якімі заслужана славіліся Нумерманы. Ну, якраз у «такую хвіліну» — як часта гаварыла жонка — нараджалася нешта новае, раней не вядомае, нешта накшталт незямнога, ціхага шчасця. А апроч таго было і іншае, нават вышэйшае, чым проста блазноцкая радасць чакання раскошнага ложка. Нумерман ніколі не гаварыў уголас, гэта было тое, што — калі так можна сказаць — ён насіў у сабе як маленькую бяскрыўдную тайну. Часам, аднак, калі задумваўся на самоце, яму здавалася, што, можа, якраз гэта і ёсць тое пачуццё паэзіі, нешта кроўнае, хай сабе і даволі далёкае, нешта падобнае на набажэнства для простага чалавека.

Нумерман ад шчасця глынуў сліну і, на ўсякі выпадак, пакінуў свае думкі пры сабе, хоць і вельмі карцела выказацца, як бывала раней, Але стрымаўся.

Ён ужо быў спрактыкаваны ў захаванні таямніц: выкрытыя яны перастаюць радаваць, бо знікае салодкае адчуванне ўнутранай паўнаты. Прызнанні вядуць да спустошанасці. Так бывае, калі чалавек вычарпае свой банкаўскі рахунак. А добра ж яго мець, хай нават невялікі. Гэта таксама з яго вопыту. Дырэктар Нумерман не быў абмежаваны чалавек, калі гаварыць пра яго жыццёвы вопыт.

— Незабыўны! — сказаў ён пра выступленне Вінкеля ў апошнім акце, і раптам заўважыў, што ў ім нібы нараджаецца тое пачуццё паэзіі, ды яшчэ як яўна нараджаецца, так, нібы... нібы ўсярэдзіне нешта расцвітае. Наогул ён дасканала разумеў людзей, якія прападалі за духоўнымі радасцямі. Адзін бог ведае, ці меў ён сам на гэта час... Жыццё Нумермана ішло ў цяжкай рабоце і было падпарадкавана кодэксу службы. Перасесці з простай машыны ў бьюік апошняй мадэлі, яшчэ і раскошная, элегантная спартыўная машына для дзяцей— і ўсё гэта за нейкія трыццаць гадоў. А за трыццаць гадоў не ахопіш усяго на свеце, не патрапіш на ўсё, прынамсі часу не хопіць на штодзённую паэзію.

— Падумаць толькі, што гэта дае дэфіцыт! — уздыхнуў ён нечакана.

Пані Нумерман рашуча адставіла кілішак, каб не парушыць сваёй узнёсласці такой будзённшчынай.

— Дэфіцыт?

— Хіба ты не чытаеш газет, мілая? Гэтых людзей проста дураць: падаткі, розныя паборы. Бог ведае, колькі такі Вінкель можа зарабіць?

— Але ж, дарагі, яны аддаюцца больш высокім мэтам. Падумай, як яны ўзбагачаюцца, як развіваюцца...

— Так, так, але ж трэба неяк жыць, — лагодна перабіў яе Нумерман. Цікава, што б яна сказала, каб заказаць яшчэ адзін скрылік сыру, яшчэ адзін кілішак... — і ён ледзь прыкметна кіўнуў галавой. Адразу збегліся кельнеры. На тое ён і Нумерман, госць выключны. Іншыя маглі сабе круціцца, як акрабаты на трапецыі, але іх выкрунтасы не цікавілі нават малодшых кельнераў.

Раптам вочы яго на некім спыніліся.

— Глянь туды, гэта ж Вінкель...

Ён борздзенька падхапіўся і з працягнутай рукой кінуўся да шчуплаватага, добра апранутага чалавека гадоў пяцідзесяці, які ўжо некалькі разоў прайшоўся па зале, пільна шукаючы кагосьці са сваіх знаёмых. Перш чым пані Альфхільда паспела затрымаць мужа, мужчыны паціснулі рукі і падышлі да століка, і нейкі ўважлівы цень падсунуў пад зад славутаму акцёру крэсла. За гэты час Вінкель паспеў прылажыцца да ручкі пані Нумерман і сказаць: «Ах, якія вы мілыя». Калі яна нарэшце зусім апрытомнела, на стале стаяла пляшка шампанскага, а сама яна ўжо вывяргала старанна прадуманыя сентэнцыі на прадмет ігры ў апошнім акце.

Акцёр сарамяжліва падняў кілішак і сказаў:

— Але сёння не ўсё нам добра ўдалося. Марыю даймаў катар, але ўсё ж яна няблага справілася з любоўнай сцэнай.

Пані Альфхільда папярхнулася, глытнула паветра. Тым часам пан Нумерман паблажліва сказаў, што якраз гэта ён і меў на ўвазе — нельга ж выціснуць з сябе столькі слёз, не прастудзіўшыся. Але яго адразу ж прашыў недвухсэнсоўны позірк з другога боку стала.

— Сяджу гэта я сабе, — пачаў яе бесталковы муж, — і думаю, колькі можа зарабіць за год такі акцёр, як вы? Праца — адна пакута; а колькі рэпетыцый пакуль усё завучыцца напамяць, гэта, мусіць, самае горшае.

Пані Альфхільда гатова была на месцы праваліцца. Акцёр сказаў нешта зусім неспадзяванае.

— Пакута, так. Прыемна адчуваць, што цябе разумее чалавек з вашым становішчам. Наогул людзі кепска ўяўляюць сабе...

Пані Нумерман вярнулася на зямлю. На душы было так — з духоўнага, вядома, пункту гледжання — нібы яна раптам адштурхнулася ад дна і выплыла якраз ў час, каб выратаваць становішча. Але Нумерман зноў апярэдзіў яе:

— І гэта за тыя горкія трыццаць тысяч! Няўжо з такімі грашыма можна ўтрымацца на паверхні?

Вінкель паціснуў плячыма. Нумерман гаварыў толькі тое, што вычытаў з газет. Трыццаць тысяч пры такім поспеху...

Не паспела пані Альфхільда апамятацца, як на стале ўжо стаяў новы кубэлак з лёдам, а мужчыны гаварылі аб курсе, інвестыцыях, працэнтах... Пані Нумерман вушам сваім не верыла. Яны гаварылі, як на мужчынскіх абедах, а ўсё гэта для яе — што кітайская грамата.

— Супакойся, мілы,—горача шапнула яна, намацваючы пад сталом нагу мужа. Але памылілася і наступіла на чужую. Пан Вінкель неяк разгублена паглядзеў на яе, пасля падняў кілішак, нібы п'ючы да яе, як таго вымагала ветлівасць і сітуацыя. Пані Нумерман пачырванела і схапілася за сумачку.

Вінкель адразу сарыентаваўся.

— Позна ўжо, пані пэўна стамілася, я вельмі ўдзячны, незвычайна цікава...

Нумерман і тут не даў сябе апярэдзіць:

— Ах, што вы, што вы. Праўда, Альфхільда? Сапраўды было вельмі прыемна. А цяпер прашу вас да нас, вып'ем чаго мацнейшага.— І дадаў: — Яна ў мяне, павінен вам прызнацца, мае вопыт, умее выпіць. Яшчэ не радзіўся той чалавек, які б спаіў маю Альфхільду.

Ноч была халодная высока ў небе ззялі зоркі, калі славуты акцёр Вінкель пехатой вяртаўся дамоў — не хацеў ехаць машынай. На развітанне пані Альфхільда сказала: «Самотная зорка вяртаецца дамоў пад зорным небам!» Так, дзіўныя стварэнні ёсць на белым свеце.

Вінкеля развесялілі віскі і сардэчныя словы. Людзі хваляць мастацтва высокімі словамі і залётамі. Калісьці ён умеў скарыстаць начныя прыгоды, умеў раніцай паміж рэпетыцыямі расказаць трапны анекдот пра мяшчан, якія захапляюцца мастацтвам. Але не цяпер. Цяпер ужо не да анекдотаў. Апрача таго Нумерман, здавалася, сапраўды загарэўся думкай выратаваць заняпалы тэатр. Што ж, хай ратуе. Вельмі дзіўныя стварэнні! Але ж якраз такія людзі і плацяць за білеты, для іх акцёры і стараюцца на сцэне. Выпадак з нагой пад сталом — вынік яўнай памылкі.

Нумерманы стаялі ў альтанцы, атуленыя мяккім аксамітам ночы. Душы іх перапаўняла паэзія. Вечар быў цудоўны, гаварылі аб акцыях, аб дэфіцыце і становішчы ў галіне мастацтва. Заглядвалі за кулісы. Невыказныя пачуцці апанавалі пані Альфхільду, калі яна стаяла ў альтанцы, абдымаючы неабдымнага мужа.

— Мільярды мільярдаў, — сказала ў экстазе. Гаварыла пра зоркі. Ноччу пані Альфхільда мела слабасць да філасофскіх роздумаў.

Муж таксама быў у высокапаэтычным настроі. Ён паглядзеў на зорнае неба і ўзрушана, нібы прымаючы важнае рашэнне, вымавіў:

— Трыццаць тысяч!

ЕХАН БОРГЕН (1902 г. нараджэння)—адзін з самых таленавітых нарвежскіх пісьменнікаў стагэйшага пакалення, аўтар многіх зборнікаў навел, раманаў, драматычных твораў, радыёінсцэніровак і крытычных артыкулаў па пытаннях літаратуры і тэатра. Борген паходзіць з колаў гарадской інтэлігенцыі, і таму гэтае асяроддзе часцей за ўсё бывае аб'ектам яго псіхалагічных даследаванняў. Прапануем увазе чытачоў навелу «Нумерманы», перакладзеную для газеты Васілём Сёмухам.

Куток калекцыянера

ГЕРОЯМ КОСМАСУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Савецкі Саюз паслядоўна ажыццяўляе ўсебаковую праграму касмічных даследаванняў. Паспяхова закончыўся мнагасутачны групавы палёт савецкіх пілатуемых касмічных караблёў «Саюз-6», «Саюз-7» і «Саюз-8». Сем савецкіх касманаўтаў — Г. Шонін, В. Кубасаў, А. Філіпчанка, В. Волкаў, В. Гарбатка, У. Шаталаў, А. Елісееў — выканалі вялікі аб'ём работ, неабходных для ўдасканалення тэхнікі пілатавання касмічных караблёў і стварэння арбітальных станцый. Цяпер іх імёны вядомы ўсяму свету.

Выдатнаму дасягненню савецкай навукі і тэхнікі, новаму кроку ў асваенні касмічнай прасторы прысвячаецца выпуск касмічнай серыі, якая складаецца з трох паштовых мініяцюр.

Арыгінальная кампазіцыйная будова серыі: усе тры мініяцюры, прысвечаны экіпажам касмічных караблёў «Саюз-6», «Саюз-7» і «Саюз-8», размяшчаюцца на адным лісце.

Спалучэнне строгага чорна-алюмінавага і святочнага залацістага тонаў — такое каляровае вырашэнне серыі.

Аўтар серыі—мастак Яўгеній Аніскін. Друк — глыбокі. Наміналы па 10 капеек. Памер па перфарацыі кожнай маркі—30 на 42 міліметры. Зубцоўка — грабеньчатая.

Нумары па каталогу — 3850, 3851, 3852.

ЦІ ВЫПІСАНА Ў ВАС НА НАСТУПНЫ ГОД ГАЗЕТА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»?

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ПАЎСЮДНА

ПАСТАРАЙЦЕСЯ АФОРМІЦЬ ЯЕ СВОЕЧАСОВА.

Калектыў часопіса «Беларусь» выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы рэдакцыі Струсевіч А. А. з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці маці.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

28 кастрычніка

Першая праграма. 9.10 — тэлебачанне — школе. Фізіка. 10-ы клас. «Прырода электрычнага току ў электралітах». 9.40 — «Чытаючы каменную кнігу». Кінанарыс. 10.00 — навіны (М). 10.15 — «Балада аб першым». «Волгаградскі трактарны». Перадача з Волгаграда. 10.45 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны церамок». Перадача з Пярмі. 11.15 — тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя». Перадача з Арла. 16.55 — праграма перадач. 17.00 —«Навіны» (М). 17.15 — для школьнікаў. «Твой жывы куток». Парады біёлага. Перадача другая. 17.45 — «Панарама навін». 18.00 — да дня нараджэння камсамола. «Мы—маладая гвардыя». Прэм'ера тэлевізійнага дакументальнага фільма. 2-я серыя (М). 19.00 — «Ленінскі універсітэт мільёнаў». «Сучасны рэвалюцыйны працэс і праблемы тэорыі». Па матэрыялах міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый (М). 19.30 — «Камерныя цыклы». П. Падкавыраў. «Англійская сюіта». 19.45 — «Будаўнік». Тэлевізійны часопіс. 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.00 — «Караецца законам». Выступленне намесніка начальніка УУС Мінгарвыканкома Ф. Е. Рутковскага. 21.15 — «Зося». Мастацкі фільм. 22.20 — «Антэны і тэлевізійны прыём». Тэхнічная кансультацыя. 22.50 — «Непераможныя». Кінанарыс. 23.30 — для студэнтаў вну. «Вышэйшая матэматыка». II курс. 24.00 — «Навіны» (М).

29 кастрычніка

Першая праграма. 9.10 — тэлебачанне — школе. «Прыродазнаўства». 4-ы клас. «Багацці нетраў беларускай зямлі». 9.40 — «Ля вытокаў старажытнай ракі». Кінанарыс. 10.00 —навіны (М). 10.15— «Праз дваццаць гадоў». Мастацкі фільм (М). 11.30 — «Мы —камуністы». «Сакратар сельскага райкома». Тэлевізійны нарыс (М). 12.00 — «Гаспадарчая рэформа ў дзеянні». Перадача з Ленінграда. 15.10 —праграма перадач. 15.15— школьная фільматэка. «Бацькі і дзеці». Мастацкі фільм. 17.00 — для школьнікаў. «Першамайская, 12». 17.30 — «Панарама навін». 17.45 — да дня нараджэння камсамола. «Мы —маладая гвардыя». Прэм'ера тэлевізійнага шматсерыйнага дакументальнага фільма. 3-я і 4-я серыі (М). 19.30 — праграма каляровага тэлебачання. Чэмпіянат СССР па хакеі. «Дынамо» (М)—ЦСКА (М). У перапынках і пасля заканчэння — «Навіны» (М). 22.00 — «Памяць пакалення». Тэлевізійны мастацкі фільм. 23.15 —«Навіны» (М). 23.25 — для студэнтаў вну. «Фізіка». II курс.

30 кастрычніка

Першая праграма. 10.00 — «Навіны» (М). 10.15 — для школьнікаў. «Вартавыя прыроды». Перадача з Петразаводска. 10.45 —для школьнікаў. «Паплечнікі У. І. Леніна». Ф. Э. Дзяржынскі (М). 16.25— праграма перадач. Тэлевізійны фестываль абласцей Беларусі. «У эфіры—ардэнаносная Гомельшчына». 16.30 — «Вуліцы помняць». Тэлянарыс. 16.50 — «Праз дзесяць гадоў». Аб першай на Гомельшчыне брыгадзе камуністычнай працы. 17.15 — «Тры біяграфіі». Тэлянарыс. 17.40 — «Вёска мяняе аблічча». Пра сельскае будаўніцтва ў Гомельшчыне. 18.00 —да дня нараджэння камсамола. «Мы — маладая гвардыя». Прэм'ера тэлевізійнага шматсерыйнага дакументальнага фільма. 5-я серыя (М). 18.30 — «Ленінскі універсітэт мільёнаў». «У. І. Ленін аб самаадукацыі» (М). 19.00 — чэмпіянат СССР па футболе. «Дынамо» (Кіеў) — «Спартак» (М). Перадача з Кіева. У перапынку і пасля заканчэння — «Навіны» (М). 21.00— «Ленінскім шляхам». Выступленне сакратара Гомельскага абкома партыі Р. С. Жданко. 21.15—«Панарама навін». 21.30 — «То быў пачатак...» Тэлевізійны спектакль. 22.15 — «Трэці працоўны». Тэлянарыс. 22.35 — «Гомель—горад універсітэцкі». 23.10 — «Панарама навін». 23.20 — «Маладыя галасы». Канцэрт.

Літаратура і мастацтва 4

Аўторак, 28 кастрычніка 1969 г.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М.